Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 40 (454) | Нядзеля, 3 снежня 1939 года | Цана 20 кап.

„Мы стаім цвёрда за тое, каб свае ўнутраныя і знешнія справы рашаў сам фінляндскі народ, як гэта ён сам лічыць патрэбным“.

(З прамовы па радыё Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. В. М. Молатава).

ТРЫБУН РЭВОЛЮЦЫІ, АРГАНІЗАТАР МАС

У памяці і сэрцы вялікага совецкага народа жыве і вечна будзе жыць слаўнае імя і светлы вобраз вернага сына большэвіцкай партыі — Сяргея Міронавіча Кірава.

Пяць год таму назад заклятыя ворагі народа — трацкісцка-бухарынскія бандыты, наймíты замежных разведак, злодзейскай куляй абарвалі ў пеоыяд поўнага росквіту творчых сіл жыццё любімца партыі і народа Сяргея Міронавіча Кірава.

Совецкі народ, з'яднаны вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, пакляўся над прахам Сяргея Міронавіча змесці з нашай зямлі ўсю подлую нечысць, выкарчаваць і знішчыць варожыя банды і іх агіднае ахвосце.

Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна совецкі народ здзейсніў сваю клятву. Ачышчана совецкая зямля ад злодзейскіх банд ворагаў народа. Ярка гарыць над нашай зямлёй сонца Сталінскай Канстытуцыі, асвятляючы шлях к комунізму. І цудоўнымі справамі эпохі соцыялізма, квітненнем совецкай зямлі, завяршэннем справы, за якую да апошняга ўдара свайго сэрца змагаўся Сяргей Міронавіч Кіраў — пабеданосным рухам к комунізму збудаван партыяй і народам найвелічны помнік свайму любімаму сыну — незабыўнаму Сяргею Міронавічу.

У радах большэвіцкай партыі трыццаць год геройчна змагаўся Сяргей Міронавіч Кіраў за перамогу соцыялістычнай рэволюцыі і будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне, за справу Леніна—Сталіна.

Мужны арганізатар большэвіцкага падполля ў Томску і ў Владзікаўказе. Кіраўнік барацьбы за ўстанаўленне совецкай улады на Паўночным Каўказе. Выдатны пролетарскі палкаводзец, арганізатар геройчнай абароны Астрахані ў 1919 годзе. Сакратар ЦК комуністычнай партыі Азербайджана. Кіраўнік большэвікоў Ленінграда. Буйнейшы палітычны дзеяч—адзін з кіраўнікоў большэвіцкай партыі і совецкага ўрада, саратнік і друг вялікага Сталіна. Вось жыццёвы шлях Сяргея Міронавіча — шлях вернага сына народа, выхаванага і загартаванага большэвіцкай партыяй, непахіснага, непрымірымага да ворагаў большэвіка, палітычнага і дзяржаўнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу.

Сяргей Міронавіч Кіраў быў любімым другам совецкіх літаратараў, работнікаў мастацтва. Ён шмат сілы і энергіі аддаваў справе росквіту соцыялістычнай культуры — літаратуры, навукі, мастацтва.

І вобраз Кірава — вялікага трыбуна партыі, выдатнага арганізатара народных мас—натхняе пісьменнікаў, майстроў мастацтва на самаадданае служэнне народу, вялікай справе Леніна—Сталіна, натхняе творча на стварэнне класічнага вобраза дзеяча соцыялістычнай эпохі, якім быў Сяргей Міронавіч.

Вучыцца ў Кірава большэвіцкай страснасці і мудрай прастаце слова павінны совецкія літаратары.

Быць, як Кіраў, бязмежна адданым соцыялістычнай радзіме, справе большэвіцкай партыі, вялікаму Сталіну і, як Кіраў, быць непрымірымым і бязлітасным да ворага — пярвейшы абавязак кожнага совецкага інтэлігента.

Наймíты капіталістычных разведак злодзейска абарвалі жыццё Сяргея Міронавіча Кірава. І сёння існуе капіталістычнае акружэнне. Ні на хвіліну нельга забываць гэтага. Быць пільным, быць у мабілізацыйнай гатоўнасці павінен совецкі народ.

Па ўказцы агрэсараў — падпальшчыкаў вайны на Захадзе, фінляндская ваеншчына распачала правакацыйную ігру, ствараўшы пагрозу нападу на Ленінград—калыбель соцыялістычнай рэволюцыі, горад, які непарыўна звязан з іменем С. М Кірава.

Урад Совецкага Саюза, выражаючы волю ўсяго совецкага народа, прыняў патрэбныя захады для гарантыравання безапаснасці нашай радзімы.

Совецкі народ падаў руку фінскаму народу, каб назаўсёды ліквідаваць ваенную небяспеку і ўстанавіць дружэственыя ўзаемаадносіны паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй.

Народ Фінляндыі, жадаючы жыць у дружбе з вялікім совецкім народам, падняў сцяг паўстання, утварыў народны ўрад Дэмакратычнай Рэспублікі. Фінскі народ узняўся на рашучую барацьбу супроць здраднікаў і катаў—прэзрэннага ўрада Каяндэра—Эркко—Таннера. У дружбе з 183-мільённым совецкім народам фінскі народ пабудуе вольнае, шчаслівае жыццё. Расквітнее дабрабыт і культура фінскага народа.

Совецкі Урад заключыў з Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікай пакт аб узаемадапамозе і дружбе. Нікому і ніколі не ўдасца нарушыць дружбы совецкага і фінляндскага народаў!

Гораду Леніна, за росквіт якога нястомна змагаўся Сяргей Міронавіч Кіраў, больш не будзе пагражаць небяспека. І справу, за якую аддаў свае слаўнае жыццё Сяргей Міронавіч Кіраў, — справу будаўніцтва комунізма, пабеданосна завяршыць вялікі совецкі народ.

Прамова па радыё Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. В. М. МОЛАТАВА

29 лістапада 1939 года

Грамадзяне і грамадзянкі Совецкага Саюза!

Варожая ў адносінах нашай краіны палітыка цяперашняга ўрада Фінляндыі вымушае нас прыняць неадкладныя меры па забеспячэнню знешняй дзяржаўнай безапаснасці.

Вы ведаеце, што на працягу двух апошніх месяцаў Совецкі Урад цярпліва вёў перагаворы з фінляндскім урадам аб прапановах, якія, у сучаснай трывожнай міжнароднай абстаноўцы, ён лічыў мінімальнымі для забеспячэння безапаснасці краіны і асабліва для безапаснасці Ленінграда. Фінляндскі ўрад заняў у гэтых перагаворах непрымірыма варожую да нашай краіны пазіцыю. Замест таго, каб дружэственым чынам знайсці глебу для пагаднення, цяперашнія фінляндскія правіцелі, ва ўгоду замежных імперыялістаў — падпальшчыкаў варожасці да Совецкага Саюза, пайшлі па іншаму шляху. Нягледзячы на ўсе зробленыя намі ўступкі, перагаворы скончыліся безрэзультатна.

Цяпер вядома, да чаго гэта прывяло.

У апошнія дні на совецка-фінляндскай граніцы пачаліся абураючыя правакацыі фінляндскай ваеншчыны, аж да артылерыйскага абстрэлу нашых воінскіх часцей пад Ленінградам, прывёўшага да цяжкіх афяр у чырвонаармейскіх часцях. Спробы нашага ўрада практычнымі прапановамі, звернутымі да фінляндскага ўрада, папярэдзіць паўтарэнне гэтых правакацый, не толькі не сустрэлі падтрымання, але зноў наштурхнуліся на варожую палітыку правячых кругоў Фінляндыі. На нашы прапановы, як вы ведаеце з учарашняй ноты Совецкага Урада, яны адказалі варожай адмовай і нахальным адмаўленнем фактаў, здзеклівымі адносінамі да панесеных намі афяр, непрыкрытым імкненнем і ў далейшым трымаць Ленінград пад непасрэднай пагрозай сваіх войск.

Усё гэта канчаткова паказала, што цяперашні фінляндскі ўрад, які заблытаўся ў сваіх антысовецкіх сувязях з імперыялістамі, не хоча падтрымліваць нармальных адносін з Совецкім Саюзам. Ён працягвае займаць варожую пазіцыю ў адносінах нашай краіны і не хоча лічыцца з патрабаваннямі заключанага паміж нашымі краінамі пакта ненападу, жадаючы трымаць наш слаўны Ленінград пад ваеннай пагрозай. Ад такога ўрада і яго безрассуднай ваеншчыны можна чакаць цяпер толькі новых наглых правакацый.

Таму Совецкі Урад вымушан быў учора заявіць, што ад гэтага часу ён лічыць сябе свабодным ад абавязацельстваў, узятых на сябе ў сілу пакта аб ненападзе, заключанага паміж СССР і Фінляндыяй і безадказна нарушаемага ўрадам Фінляндыі.

З прычыны новых фактаў нападу фінляндскіх воінскіх часцей на совецкія войскі ля совецка-фінляндскай граніцы, урад вымушан цяпер прыняць новыя рашэнні.

Урад не можа больш цярпець ствараўшагася становішча, адказнасць за якое поўнасцю кладзецца на ўрад Фінляндыі.

Урад прышоў к вываду, што больш ён не можа падтрымліваць нармальных адносін з урадам Фінляндыі і таму прызнаў неабходным неадкладна адклікаць з Фінляндыі сваіх палітычных і гаспадарчых прадстаўнікоў.

Урад даў, разам з тым, распараджэнне галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — быць гатовым да ўсякіх нечаканасцей і неадкладна прэсякаць магчымыя вылазкі з боку фінляндскай ваеншчыны.

Варожая нам замежная прэса сцвярджае, што прымаемыя намі меры праследуюць мэты захвату або далучэння да СССР фінляндскай тэрыторыі. Гэта — злосны паклёп. Совецкі Ўрад не меў і не мае такіх намераў. Больш таго. Пры наяўнасці дружэственай палітыкі з боку самой Фінляндыі ў адносінах Совецкага Саюза, Совецкі Ўрад, які заўсёды імкнуўся да дружэственых адносін з Фінляндыяй, быў-бы гатоў пайсці ёй насустрач па частцы тэрытарыяльных уступак з боку СССР. Пры гэтай умове Совецкі Урад быў-бы гатоў спрыяюча абмеркаваць нават такое пытанне, як пытанне аб з'яднанні карэльскага народа, насяляючага асноўныя раёны цяперашняй Совецкай Карэліі, з родственым яму фінскім народам у адзінай і незалежнай фінляндскай дзяржаве. Для гэтага, аднак, неабходна, каб урад Фінляндыі займаў у адносінах СССР не варожую, а дружэственую пазіцыю, што адпавядала-б кроўным інтарэсам абодвух дзяржаў.

Іншыя сцвярджаюць, што праводзімыя намі меры накіраваны супроць незалежнасці Фінляндыі або на ўмяшанне ў яе ўнутраныя і знешнія справы. Гэта — такі-ж злосны паклёп. Мы лічым Фінляндыю, які-б там рэжым ні існаваў, незалежнай і суверэннай дзяржавай ва ўсёй яе знешняй і ўнутранай палітыцы. Мы стаім цвёрда за тое, каб свае ўнутраныя і знешнія справы рашаў сам фінляндскі народ, як гэта ён сам лічыць патрэбным. Народы Совецкага Саюза зрабілі ў свой час тое, што патрэбна было для стварэння незалежнай Фінляндыі. Народы нашай краіны гатовы і ў далейшым аказаць дапамогу фінляндскаму народу ў забеспячэнні яго свабоднага і незалежнага развіцця.

Совецкі Саюз не мае таксама намераў ушчаміць у якой-небудзь меры інтарэсы іншых дзяржаў у Фінляндыі. Пытанні ўзаемаадносін паміж Фінляндыяй і іншымі дзяржавамі з'яўляюцца справай выключна самой Фінляндыі, і Совецкі Саюз не лічыць сябе ў праве ўмешвацца ў гэтую справу.

Адзінай мэтай нашых мерапрыемстваў з'яўляецца — забеспячэнне безапаснасці Совецкага Саюза і асабліва Ленінграда з яго трох з палавінай мільённым насельніцтвам. У сучаснай накалёнай вайной міжнароднай абстаноўцы рашэнне гэтай жыццёвай і неадкладнай задачы дзяржавы мы не можам паставіць у залежнасць ад злой волі цяперашніх фінляндскіх правіцеляў. Гэтую задачу прыдзецца рашыць намаганнямі самаго Совецкага Саюза ў дружэственым супрацоўніцтве з фінляндскім народам.

Мы не сумняваемся, што спрыяючае вырашэнне задачы забеспячэння безапаснасці Ленінграда паслужыць асновай непарушнай дружбы паміж СССР і Фінляндыяй.



НЯХАЙ ЖЫВЕ ДРУЖБА СОВЕЦКАГА І ФІНЛЯНДСКАГА НАРОДАЎ!

Фінляндскі народ адчуў праўду

Словы главы совецкага ўрада Вячаслава Міхайлавіча Молатава, у якіх адчуваецца шчырая пашана і сардэчная прыязнь да фінскага народа, дайшлі да сэрца працоўных мас Фінляндыі.

Фінскі народ, абураны гневам супроць наймітаў сусветнай буржуазіі, супроць свайго здрадніцкага ўрада, скінуў яго, нібы ядавітую змяю з сваіх грудзей. Гэты ўчынак разумны і справядлівы.

Фінскі народ адчуў праўду і выратаваў сябе ад прадажнага ўрада, які хацеў давесці народ да непатрэбных афяр і зруйнавання народнага багацця.

З працоўным народам Фінляндыі Совецкі Саюз будзе гаварыць па-братэрску і будуць знойдзены такія ўмовы міралюбівага суседскага сужыцця, якія прынясуць карысць і нам, і народнай Фінляндыі.

Няхай жыве дружба між вялікім Совецкім Саюзам і працоўным народам Фінляндыі!

З. БЯДУЛЯ.

Здзейсняцца мары народа

Фінляндскі народ не хоча вайны. Ён не згодзен з варожай, антысовецкай палітыкай сваіх міністраў. Фінскія рабочыя і сяляне —нашы браты. Не вайну, а мір і вызваленне нясе фінляндскаму народу наша непераможная Чырвоная Армія.

Урад Каяндэра—Эркко, як і трэба было чакаць, аказаўся нядоўгавечным. Працоўны народ Фінляндыі не дапусціў далейшага панавання над сабою безадказнай кучкі палітыканаў. Новы, сапраўды народны ўрад Фінляндыі здолее забяспечыць фінскаму народу мірнае і спакойнае жыццё, росквіт культуры і эканомікі на базе дружбы з вялікім Совецкім Саюзам. Толькі такі ўрад здолее ажыццявіць векавечныя мары фінскага народа і аб'яднаць яго з братнім, адзінакроўным карэльскім народам.

Віт. ВОЛЬСКІ.

Радасць для кожнага совецкага патрыёта

У Фінляндыі створан народна-рэволюцыйны ўрад. Уся краіна ахоплена паўстаннямі. Там адбываецца сапраўдны народная рэволюцыя супроць урада Каяндэра, які хацеў запрадаць Фінляндыю сусветным ваенным авантурыстам. Чырвоная Армія дапаможа фінскаму народу вызваліцца з-пад апекі замежных падпальшчыкаў вайны. Народны ўрад дасць бедным сялянам зямлю, рабочым—працу і хлеб, інтэлігенцыі—магчымасць свабодна тварыць на шчасце народа. У Фінляндыі пышна расквітнее навука, культура літаратура і мастацтва.

Гэта будзе народная рэспубліка, якая будзе звязана дружбай з Совецкім Саюзам. Сцяг народнага ўрада будзе горда лунаць над дэмакратычнай Фінляндыяй.

Няхай жыве вольная дэмакратычная Фінляндыя!

Няхай жыве свабодны працалюбівы фінскі народ!

Ал. КУЧАР.

Вітаю шчыра

Краіну Калевалы я заўсёды ўяўляў сабе населенай працавітымі, да фанатызма сумленнымі людзьмі з блакітнымі вачыма.

Мне не давялося пабываць у ёй. І толькі з акна вагона меў я магчымасць у суровым паўночным ландшафце падглядзець мяккую журботнасць фінскага блакіта. Гэта было даўно. Я быў тады юнаком-чырвонаармейцам, якога цягнік імчаў на поўнач, на поўнач...

Часамі зайздросціў я гэтым людзям з блакітнымі вачыма. Я абавязкова ўяўляў сабе іх у блакітных шхерах, з невялічкімі люлькамі ў руках, спакойнымі, як багі грэцкага Алімпа. Я не ведаў яшчэ тады, што за блакітнымі шхерамі хаваецца беззямелле і галеча сялянства. Я даведаўся потым, што між родных азёраў за кратамі пакутуе чалавек, імя якога Антыкайнен. Яго любімая краіна зрабілася арэнай для гульні буйных імперыялістычных драпежнікаў.

Але сёння радыё прынесла радасную чутку. Людзі з блакітнымі вачыма на час схавалі свае люлькі і ўзялі ў рукі стрэльбы, каб расквітацца са сваімі Каяндэрамі і Манергеймамі. Працавіты фінскі народ адсячэ ім рукі, працягнутыя супроць Совецкага Саюза.

Вітаю народ Калевалы з першым днём яго світання, з першым днём яго сапраўды народнай улады!

Знаеце кантэлэ, спявайце радасныя песні вызваленага народа!

Р. МУРАШКА.

ЎТВАРЭННЕ НАРОДНАГА УРАДА ФІНЛЯНДЫІ

ЛЕНІНГРАД, 1 снежня. (ТАСС). Сёння ў гор. Тэрыокі па пагадненню прадстаўнікоў раду левых партый і паўстаўшых фінскіх салдат утварыўся новы ўрад Фінляндыі — народны ўрад Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі. У састаў народнага ўрада ўвайшлі: Отто Куусінен — старшыня ўрада і міністр замежных спраў, Маўры Розенберг — міністр фінансаў, Аксел Анціла — міністр абароны, Туурэ Лехен — міністр унутраных спраў, Армас Эйкія — міністр земляробства, Інкеры Лехцінен — міністр асветы, Паво Пракконен — міністр па справах Карэліі.

Народны ўрад выпусціў дэкларацыю з ізлажэннем сваёй праграмы.

Дэкларацыя народнага ўрада Фінляндыі

(Радыё-перахват. Пераклад з фінскай мовы)

Па волі народа, абуранага злачынай палітыкай прэзрэннага ўрада Каяндэра—Эркко—Таннера, сёння ва ўсходняй Фінляндыі ўтворан новы ўрад нашай краіны, часовы **народны ўрад**, які гэтым заклікае ўвесь фінляндскі народ на рашучую барацьбу за звяржэнне тыраніі катаў і правакатараў вайны.

Рэакцыйная, прагавітая плутакратыя, якая ў 1918 годзе з дапамогаю войск замежных імперыялістаў патапіла ў моры крыві дэмакратычную свабоду фінляндскага працоўнага народа, ператварыла нашу радзіму ў белагвардзейскае пекла для працоўных. Прадаўшы інтарэсы самастойнасці краіны, плутакратычныя заправілы Фінляндыі, разам з усякімі імперыялістычнымі ворагамі фінляндскага і совецкага народаў, безупынна страпалі планы антысовецкіх ваенных правакацый і, нарэшце, ўвергнулі нашу краіну ў горніла вайны супроць соцыялістычнага Совецкага Саюза — вялікага прыяцеля фінляндскага народа.

У гэтай крытычнай абстаноўцы шырокія масы фінляндскага працоўнага народа, якія заўсёды хацелі і хочуць жыць у міры з народамі краіны Советаў, лічаць сваім элементарным правам і сваім свяшчэнным абавязкам узяць лёс радзімы ў свае надзейныя рукі. У розных частках краіны народ паўстаў ужо і правазгласіў стварэнне **дэмакратычнай рэспублікі**. Частка салдат фінляндскай арміі перайшла ўжо на бок новага ўрада, падтрымліваемага народам.

Совецкі Саюз, які ніколі не пагражаў і не трывожыў Фінляндыю, які заўсёды паважаў яе незалежнасць і на працягу двух дзесяткаў год цярпеў подлыя ваенныя правакацыі з боку авантурыстычных заправіл белa-Фінляндыі, цяпер стаў перад неабходнасцю сіламі Чырвонай Арміі пакласці канец гэтым пагрозам сваёй безапаснасці. Гэтая мэта поўнасцю адпавядае жыццёвым інтарэсам і нашага народа. Таму народныя масы Фінляндыі з велізарным энтузіязмам сустракаюць і вітаюць **доблесную, непераможную Чырвоную Армію**, ведаючы, што яна ідзе ў Фінляндыю не як заваявальнік, а як прыяцель і вызваліцель нашага народа.

Народны ўрад Фінляндыі, будучы глыбока ўпэўнены ў тым, што Совецкі Саюз не мае ніякіх мэт, накіраваных супроць незалежнасці нашай краіны, поўнасцю адабрае і падтрымлівае дзеянні Чырвонай Арміі на тэрыторыі Фінляндыі. Ён разглядае гэта як неацанімую дапамогу фінляндскаму народу з боку Совецкага Саюза для таго, каб сумеснымі намаганнямі магчыма хутчэй ліквідаваць небяспечнейшы ачаг вайны, створаны ў Фінляндыі злачынным урадам правакатараў вайны.

Для хутчэйшага выканання гэтай задачы народны ўрад Фінляндыі запрашае ўрад СССР аказваць Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспубліцы ўсю неабходную садзейнасць сіламі Чырвонай Арміі.

Для ўдзелу ў сумеснай барацьбе рука аб руку з геройчнай Чырвонай Арміяй СССР, народны ўрад Фінляндыі ўжо сфарміраваў першы **фінскі корпус**, які ў ходзе прадстаячых баёў будзе папаўняцца добраахвотнікамі з рэволюцыйных рабочых і сялян і павінен стаць моцным ядром будучай **народнай арміі Фінляндыі**. Першаму фінскаму корпусу прадастаўляецца часць прынесці ў сталіцу сцяг Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі і вадрузіць яго на даху прэзідэнцкага палаца, на радасць працоўным і страх ворагам народа.

Наша дзяржава павінна быць **дэмакратычнай рэспублікай**, якая абслугоўвае інтарэсы народа, — у адрозненне ад **плутакратычнай** рэспублікі Каяндэра—Эркко, якая абслугоўвае інтарэсы капіталістаў і памешчыкаў. Але наша дзяржава не з'яўляецца ўсё-ж дзяржавай совецкага тыпу, бо совецкі лад не можа быць устаноўлен сіламі аднаго толькі ўрада без згоды ўсяго народа і ў прыватнасці сялянства.

Адпаведна з гэтым наш урад з'яўляецца народным урадам Дэмакратычнай Рэспублікі Фінляндыі. Ён будзе апірацца на шырокі **працоўны народны фронт**. У цяперашнім сваім саставе народны ўрад Фінляндыі лічыць сябе часовым урадам. Яго састаў будзе зараз-жа па прыбыцці ў сталіцу краіны, Хельсінкі, рэарганізаван і пашыран прадстаўнікамі розных партый і груп, прымаючых удзел у працоўным народным фронце. Канчатковы састаў народнага ўрада, яго паўнамоцтвы і дзеянні падлягаюць санкцыі **сейма**, выбранага на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права, пры тайным галасаванні.

Народны ўрад Фінляндыі разглядае як сваю першаступенную задачу звяржэнне ўрада фінляндскіх белагвардзейцаў, разгром яго ўзброеных сіл, заключэнне міру і забеспячэнне незалежнасці і безапаснасці Фінляндыі шляхам устанаўлення моцных дружэственых адносін з Совецкім Саюзам.

Народны ўрад Фінляндыі звяртаецца да ўрада СССР з прапановай заключыць пакт узаемадапамогі **паміж Фінляндыяй і Совецкім Саюзам** і задаволіць векавую нацыянальную надзею фінскага народа на **з'яднанне з ім карэльскага народа ў адзінай і незалежнай фінляндскай дзяржаве**. Народны ўрад Фінляндыі мае ўсе падставы спадзявацца, што яго цвёрды курс, узяты на ўстанаўленне дружэственых адносін з Совецкім Саюзам, дасць ураду СССР магчымасць задаволіць такую прапанову.

Народны ўрад жадае падтрымаць дружэственыя адносіны і з усімі іншымі дзяржавамі. Ён прызнае гаспадарчыя і фінансавыя абавязацельствы Фінляндыі ў адносінах да іншых дзяржаў, паколькі гэтыя абавязацельствы не пярэчаць суверэнітэту Фінляндыі і паколькі якая-небудзь з гэтых дзяржаў не прадпрыме варожых крокаў супроць Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі і яе народнага ўрада.

У сваёй унутранай палітыцы народны ўрад ставіць сабе наступныя задачы:

1) стварэнне народнай арміі Фінляндыі;

2) устанаўленне дзяржаўнага кантролю над буйнымі прыватнымі банкамі і буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі і мерапрыемствы па садзейнасці сярэднім і дробным прадпрыемствам;

3) правядзенне мерапрыемстваў для поўнай ліквідацыі беспрацоўя;

4) скарачэнне рабочага дня да 8 гадзін, забеспячэнне двухтыднёвага летняга водпуску рабочым і зніжэнне кватэрнай платы для рабочых і служачых;

5) канфіскацыя зямель буйных памешчыкаў-землеўласнікаў, не закранаючы зямель і маёмасці сялян, і перадача канфіскаваных зямель беззямельным і малазямельным сялянам;

6) аслабаненне сялян ад уплаты недоімак па падатках;

7) усямерная дзяржаўная дапамога для ўздыму гаспадаркі маламоцных сялян, у першую чаргу шляхам адвядзення ім дадатковай зямлі, пасьбішча, а па магчымасці таксама і лесу для хатніх патрэб з канфіскаваных у буйных памешчыкаў зямель;

8) дэмакратызацыя дзяржаўнага ўстройства, адміністрацыі і судовай справы;

9) павелічэнне дзяржаўных субсідый на культурныя патрэбы і рэарганізацыя школьнай справы: забеспячэнне магчымасці наведвання школ дзецьмі рабочых і іншых маламаёмных, а таксама ўсямерныя клопаты аб развіцці народнай асветы, навукі, літаратуры і мастацтва ў прагрэсіўным духу.

Ненавісны народу плутакратычны ўрад Каяндэра—Эркко, які рабіў усё магчымае каб пагубіць нашу радзіму, страціўшы ўсякае падтрыманне ў народзе, аказаецца, падаў у адстаўку. Гэты ненавісны ўрад заменен урадам Таннера. Але Таннер такі-ж вораг нашага народа, як і Каяндэр. Урад Таннера ні на ёту не лепш, калі не горш урада Каяндэра. Ён таксама ненавісны нашаму народу, як і ўрад Каяндэра.

Прагнаць гэтых катаў падалей ад Фінляндыі! Скінуць усю збанкроціўшуюся ўрадавую шайку!

Уставай шматпакутны працоўны народ Фінляндыі! Ідзі на смелую барацьбу супроць тыраніі тваіх прыгнятальнікаў і катаў!

Уставайце ўсе грамадзяне, каму дарага будучыня радзімы!

Скінем з плеч народа зграю чорнай рэакцыі!

Ачысцім шлях для ўздыму народнага дабрабыту і культуры, для ажыццяўлення векавых нацыянальных спадзяванняў нашага народа!

Няхай пераможа кроўная справа рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі Фінляндыі!

Пад сцягам свабоднай і незалежнай Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі— уперад да перамог!

Старшыня народнага ўрада і міністр замежных спраў Фінляндыі ОТТО КУУСІНЕН.

Намеснік старшыні народнага ўрада і міністр фінансаў МАЎРЫ РОЗЕНБЕРГ.

Міністр абароны АКСЕЛ АНЦІЛА.

Міністр унутраных спраў ТУУРЭ ЛЕХЕН.

Міністр земляробства АРМАС ЭЙКІЯ.

Міністр асветы ІНКЕРЫ ЛЕХЦІНЕН.

Міністр па справах Карэліі ПААВО ПРАКОНЕН.

У горадзе Тэрыокі.

1 снежня 1939 г.

ВОБРАЗ С. М. КІРАВА БУДЗЕ ВЕЧНА ЖЫЦЬ У СЭРЦАХ МІЛЬЁНАЎ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СВЕТА



С. М. Кіраў.
Рэпрадукцыя з партрэта работы мастака С. М. Бондар.

НА СМЕРЦЬ КІРАВА

Ворагамі Кіраўская кроў праліта,
Ён куляю варожаю забіты.
Вы смерці Кірава не радуйцеся,
ворагі і чмуты.
Бо не аслабіла яна радоў нашых
магутных

Забойцы, сволачы, вы Кірава забілі,
Але яго мільёны замянілі.
У жылах мільёнаў Кіраўская кроў
струменіць,

У сэрцах мільёнаў адвагай дух яго
праменіць.
А вас, ворагаў, мы знішчым, нібы
змеяў.
Няма жыццю пад зоркаю чырвонай
ліхадзеям.

(Запісана бабруйскім рабочым А. Вярбою са слоў рабочага Хаіма Копента. Архіў фальклорнай секцыі Акадэміі навук БССР).

СЛОВА СМУТКУ

Пераклад з лакскай мовы.

Гэта сумная вестка дайшла да мяне, калі аб другім я думаў, Міроныч. Сцяўшы зубы да крыві, да болю ў скронях, я агледзеў сваю зброю. Гора мне! Чаму мяне не было побач з табою, каб спыніць кулю злачынца? Гора мне! Чаму мяне не было побач — я-б грудзьмі сваімі абараніў цябе, верны таварыш!

Друг і саратнік Сталіна! Лепшы з лепшых баец!..

Гэту песню складаючы, клянуся, я не маю сілы стрымаць стогну. Ад лютай нянавісці да ворага дрыжыць маё цела.

Я вышаў з саклі. Была цішыня над гарамі. Туман рассцілаўся ў цяснінах. Птушка сядзела на голай зямлі, сіратліва надзьмуўшыся.

— Што з табою? — спытаў я ў яе.
— Вось побач зялёны сад, у ім сумуюць па песні тваёй высокае голле і лісце. Што-ж ты, змоўкнуўшы, тут сядзіш? Можа няшчасце якое напаткала цябе?

І адказала мне птушка:

— Бачу ўсюды сёння сцягі ў жалобе. Таго, хто расціў гэты сад, таго, хто з дзіцячых гадоў прапаваў, яго расчышчаючы,— сёння не стала. Ці-ж магу я спяваць у гэты дзень, калі ў садоўнікаў гора!

Моўчкі адышоў я ад птушкі.

Над гарамі была цішыня, але хмары гусцелі ў цяснінах. Бачу, у глыбокім яры, галаву нізка схіліўшы, тур быстраногі стаіць нерухома.

Я блізка да яго падышоў:

Што з табою? — спытаў я ў яго. — Вось побач цудоўныя скалы, побач шырокія, поўныя сонца і траў, разлягліся даліны, а ты ў гэтым цесным яры — адзін... Што за смутак у цябе, жыхар вяршынных прастораў?

І тур адказаў мне:

— Загінуў вялікі чалавек, што змагаўся ў імя свабоды, у імяззяючых сонцам далін, у імя шырокіх прастораў. І ў жалобе сышоў я ў цесны яр.

Моўчкі адышоў я ад тура.

Была цішыня над гарамі, але бура раўла ў цяснінах, але маланкі ў хмарах бліскалі.

Варочаючы камені вялікія, хістаючы высокія скалы, крышачы і ломячы, размываючы рэчышча, імчаў бурлівы чорны паток... Пенай сваёй абдаючы суседнія горы, з карэннем, з зямлёй вырываючы стогадовыя сосны, ён імчаў — імклівы, грозны, магутны...

Тады закрычаў я патоку:

— Не трэба! Чакай!.. Да мора-ж і так дойдзеш, усёадно, і ў пенных бурлівых хвалях сваіх паспееш карабель ворага патапіць!

Адказаў паток:

— Я сілы не маю стрымаць сэрца гнеў.

Горы ўзрываючы ў паветра, моры асушваючы да дна, знойдзем мы смуродную нару, адшукаем ворага, ён ад нас не схаваецца... Ад нас не выратуецца здраднік!

* * *

ТРЫБУН ПАРТЫІ

Пяць год назад — 1 снежня 1934 года ў 4 гадзіны 30 мінут вечара, у Смольным, злачэйскім стрэлам быў забіт сакратар ЦК ВКП(б), сакратар ленінградскай партыйнай арганізацыі С. М. Кіраў.

С. М. Кіраў быў адным з любімейшых сыноў совецкай краіны. Адзін з кіраўнікоў большэвіцкай партыі, саратнік і друг вялікага Сталіна, Кіраў быў арганізатарам большэвіцкага падполля ў годы царызма палкаводцам у годы грамадзянскай вайны і пасля яе скančэння стаў буйнейшым дзеячом сацыялістычнага будаўніцтва. С. М. Кіраў быў выдатнейшым узорам большэвіка вялікай сталінскай эпохі. Куды-б ні пасылала яго партыя, ён высока трымаў баявы сцяг, ён ішоў наперад, незгібаемы, поўны ўпэўненасці ў перамозе вялікіх ідэй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

З трыбуны партыйных з'ездаў тав. Кіраў бязлітасна граміў трацкісцка-бухарынскіх здраднікаў. Яго магутны талент прамоўцы служыў справе партыі, справе рабочага класа.

Вялікае значэнне Кіраў надаваў рэвалюцыйнай тэорыі, большэвіцкаму, ленінскаму выхаванню партыйцаў. Кіраў часта папярэджваў партыйныя арганізацыі, што кожны новы дзень будзе ставіць перад імі новыя і больш складаныя задачы. Каб правільна іх вырашаць, большэвікі павінны яшчэ глыбей вывучаць рэвалюцыйную тэорыю, яшчэ лепш авалодваць ёю.

«Гісторыя нашай комуністычнай партыі, — гаварыў Кіраў у сваім дакладзе ў студзені 1932 года на IV ленінградскай аб'яднанай абласной і гарадской канферэнцыі ВКП(б), — ёсць гісторыя пабеданоснай пролетарскай рэвалюцыі і будаўніцтва сацыялізма. Кожная старонка, кожны радок гісторыі нашай партыі —гэта не проста хроніка падзей, гэта велізарная глыбокая навука, не ведаючы якой нельга рабіць пролетарскую рэвалюцыю».

Разам з таварышам Сталіным і таварышам Ждановым Сяргей Міронавіч прымаў удзел у напісанні заўваг на канспект падручніка па гісторыі СССР і па новай гісторыі. Гэтыя заўвагі сталі адпраўнымі вехамі ў вывучэнні гісторыі нашай краіны, гісторыі СССР і новай гісторыі. Ён быў членам Галоўнай рэдакцыі «Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР».

Нягледзячы на сваю занятасць, Сяргей Міронавіч шмат чытаў, добра ведаў класічную і сучасную літаратуру. Ён сачыў за ўсімі навінкамі літаратуры і мастацтва, за ўсімі дасягненнямі навукі і тэхнікі, любіў тэатр, музыку і шмат зрабіў для развіцця мастацтваў у Ленінградзе.

Разграмляючы ворагаў партыі, ворагаў сацыялізма, ворагаў народа, Кіраў згуртоўваў ленінградскіх большэвікоў, партыйных і непартыйных, вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта партыі, вакол Сталіна.

Сяргей Міронавіч быў поўны найглыбейшай любві, бязмежнай адданасці вялікаму правадыру, настаўніку і другу працоўных таварышу Сталіну. Гэту вялікую любоў, гэту бязмежную адданасць таварышу Сталіну Кіраў перадаў усім ленінградскім большэвікам, усім працоўным Ленінграда.

Глыбокай, бязмежнай была адданасць Кірава справе Леніна — Сталіна, справе сусветнай пролетарскай рэволюцыі.

Сяргей Міронавіч быў любімцам народа. Дзе-б ні з'яўлялася яго моцная фігура, дзе-б ні гучэў яго звонкі голас, ён прыцягваў да сябе тысячы, дзесяткі тысяч працоўных, арганізоўваў іх на барацьбу за далейшыя перамогі нашай краіны.

І іменна таму, што С. М. Кіраў быў адным з бліскучых саратнікаў вялікага Сталіна, быў буйнейшым палітычным і дзяржаўным дзеячом, банда забойцаў, здраднікаў забіла Кірава. Яны забілі яго таму, што ён бязлітасна граміў трацкісцка-зіноўеўскіх і бухарынскіх вырадкаў. Яны забілі яго таму, што ён самааддана любіў сваю радзіму, быў ёй адданы да канца, таму што ён, як і забітыя імі буйнейшыя дзеячы совецкай дзяржавы тт. Куйбышаў, Менжынскі і вялікі пісьменнік пролетарыята Максім Горкі, быў сапраўдным барацьбітом за перамогу комунізма ў нашай краіне.


Дні пахавання Кірава ператварыліся ў грандыёзную дэманстрацыю адзінства совецкага народа, яго самаахвярнай адданасці большэвіцкай партыі і свайму правадыру таварышу Сталіну.

Імя С. М. Кірава народы вялікага Совецкага Саюза не забудуць ніколі.

«Уся партыя, увесь рабочы клас і ўвесь народ нашага Совецкага Саюза будуць свята шанаваць, будуць берагчы, як зрэнку вока, памяць аб таварышу Кіраве, і ён, наш народ, паставіць вялікі помнік таварышу Кіраву, — гаварыў сакратар ЦК ВКП(б) тав. Жданаў на актыве ленінградскай партыйнай арганізацыі.

... Мы, партыя і рабочы клас, паставім помнік Сяргею Міронавічу ў справах сацыялізма, у непераможным паходзе комунізма наперад».

І. РАЗГОН.



С. М. Кіраў.
Работа скульптара А. Бразэра.

ПАМЯЦІ КІРАВА

Захлінаецца кроўю сусвет,
Разлуваюць пажарышча каты.
Над зямлёй зрабаванай плыве
Плач гаротных, праклянне магнатам.

Стогне змучаны бойняй Кітай,
Над Еўропаю — дым дынаміта...
Тыя-ж каты у наш родны край
Падаслалі калісьці наймітаў.

Падаслалі, каб здраднай змяёй
Яны шкодзілі нам. Гэта імі,
Гэта іхнай прадажнай рукой
Быў забіт Кіраў мудры, любімы.

А той дзень нам у памяць запаў, —
Не забудзецца цяжкая страта!..
І пазналі майстры чорных спраў,
Як бязлітасна наша расплата.

Як суровы народны гнеў,
Як народная помста сурова!..
Хай-жа вораг ліхі пасягне
На палеткі, на нашы дубровы! —

Мы напомнім той памятны дзень,
Калі Кіраў ад кулі загінуў,
Мы ім скажам: «Ён з намі ідзе
Бараніць залатую айчыну!».

А. МАРЦІНОВІЧ.

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Цела забітага сцяганосца Кананава — у клініцы. Вядома, што скамечаны, змочаны крывёю сцяг ляжыць у бакавой кішэні яго паліто. З вялікай рызыкай арганізуе Сяргей выратаванне сцяга.

Былі розныя прапановы, як выратаваць сцяг. Нехта прапанаваў нават паслаць у клініку якую-небудзь дзяўчыну. Прыдзе і скажа, што жаніха забілі. Яе пусцяць у клініку, яна і забярэ сцяг.

— Не, я сам дастану, — заявіў Кострыкаў. — Раскажыце, дзе знаходзіцца трупярня.

Доктар Грацыянаў падрабязна апісаў Кострыкаву, дзе знаходзіцца трупярня, растлумачыў, як знайсці вартаўніка, і параіў даць вартаўніку хабара.

Уначы Сярожа Кострыкаў разам з адным рабочым-хлапцом пералез цераз каменную сцяну ва ўніверсітэцкі сад і знайшоў там трупярню. Сярожа спрабаваў зламаць жалезныя краты на вокнах, але нічога не выйшла. На дзвярах вісеў цяжкі замок.

Пайшлі да старога вартаўніка і пачалі прасіць яго пусціць у трупярню.

— Ды вам навошта?

— А ў нас брат-студэнт прапаў. Мусіць, на дэманстрацыі забілі. Ці не трапіў ён сюды да вас?

— Студэнт, гаворыш? Ну, добра, пайшлі!

Стары адчыніў трупярню. Там было цёмна. Хлапец, які быў з Сяргеем, спалохаўся і ні завошта не хацеў ісці туды. Сяргей увайшоў адзін, адшукаў труп Кананава і выняў з кішэні нябожчыкадруга акрываўлены сцяг.

М. П.

Сяргей Міронавіч Кіраў

С. М. Кіраў нарадзіўся 27 сакавіка 1886 года ў гор. Уржуме Вяцкай губерні. Кіраў рос у цяжкія годы палітычнай рэакцыі царствавання Александра III. Гэта была пара славутага ўказа аб «кухаркіных дзецях» і паяўлення ў вёсцы земскіх начальнікаў. Народныя масы былі пазбаўлены асветы. Дзеці «выхоўваліся» і «навучаліся» папамі-невукамі ў царкоўна-прыходскіх школах. Але рускі рабочы пачаў ужо прабуджацца, рэвалюцыйны рух разрастаўся.

Маленькі Сярожа, застаўшыся круглым сіратой, выхоўваўся ў прытулку для бедных, ён рана пазнаёміўся з ссыльнымі рэвалюцыянерамі, якія пражывалі ў Уржуме, і пад іх кіраўніцтвам пачаў далучацца да рэвалюцыйнай дзейнасці. Пасля скančэння пачатковага вучылішча ў Уржуме ён прыязджае ў Казань, дзе вучыцца ў механіка-тэхнічным вучылішчы. У Казані Кіраў стаў удзельнікам рэвалюцыйных гурткоў. Гэта былі годы напярэдадні першай рэвалюцыі. 16-гадовы юнак друкаваў лістоўкі, удзельнічаў у сходках. Ён адразу акрэсліў свой шлях, як шлях сацыял-дэмакрата—леніnца.

У 1904 годзе, скончыўшы вучылішча ў Казані, Кіраў едзе ў Томск. Тут ён уступае ў Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю і хутка становіцца адным з любімых кіраўнікоў томскіх рабочых і рэвалюцыйнай моладзі.

З гэтага часу пачалася трыццацігадовая барацьба Кірава—большэвіка-ленінца за перамогу пролетарскай рэвалюцыі, за будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне. Гэтай вялікай справе Кіраў аддаў сваё жыццё да канца. Да апошняга свайго ўздыха ён быў верным сынам большэвіцкай партыі.

Куды ні пасылала Кірава партыя, ён з'яўляўся выдатным узорам большэвіка-арганізатара, сапраўдным важаком народных мас, любімцам народа. Ён быў выдатным арганізатарам большэвіцкага падполля. У 1906 годзе ў Томску ў выключна цяжкіх умовах ён арганізаваў падпольную друкарню. Выкарыстоўваючы свае веды тэхніка, ён наладзіў тайную сігналізацыю, якая павінна была своечасова папярэдзіць працуючых у друкарні аб наведванні нечаканых «гасцей».

З 1909 года Кіраў жыве ў Уладзікаўказе. Працуючы ў газеце «Терек», ён кіруе большэвіцкай нелегальнай дзейнасцю сярод рабочых, сялянскай, казачай і горскай беднаты. Ён растлумачваў горцам, што віной іх цяжкага, бяспраўнага становішча з'яўляюцца царызм, казачае афіцэрства і «вярхушка» горскіх народаў, якая здрадзіла інтарэсам горскай беднаты.

У 1917 годзе С. М. Кіраў на чале большэвіцкай арганізацыі Каўказа змагаецца за перамогу Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У складанейшых умовах, якія існавалі ў той час на Паўночным Каўказе, большэвікі пад кіраўніцтвам Кірава дамагліся спынення міжнацыянальнай вайны, якую правакавала ўвесь час казачае афіцэрства і горская буржуазія, дамагліся аб'яднання ўсіх рэвалюцыйных сіл і ўстанаўлення совецкай улады на Паўночным Каўказе.

У 1917 годзе пачалася ваенная дзейнасць Кірава, а ў 1918—20 гг. С. М. Кіраў выявіў сябе як буйнейшы пролетарскі палкаводзец.

У гісторыі грамадзянскай вайны адной з выдатнейшых старонак з'яўляецца гераічная абарона Астрахані ў 1919 годзе пад кіраўніцтвам С. М. Кірава.

Полчышчы генерала Дзенікіна, якіх падтрымлівала і снабжала англа-французская буржуазія, захапілі ўвесь поўдзень Расіі. Яны прасунуліся далёка на поўнач і ішлі да Масквы. Захапіўшы ўлетку 1919 года Царыцын, Дзенікін кінуў частку сваіх сіл на Астрахань. З мора яго падтрымлівалі ваенныя англійскія караблі. Астрахань апынулася ў кальцы. У горадзе падрыхтоўваліся контррэвалюцыйныя мяцежы, на чале якіх стаялі белагвардзейскія афіцэры. Кіраў раздушыў мяцежнікаў. Ён ператварыў Астрахань у сапраўдную совецкую крэпасць на Волзе. Дзенікіну так і не ўдалося яе ўзяць. Гераічная XI Чырвоная Армія пад кіраўніцтвам Кірава нанесла рад сакрушальных удараў Дзенікіну і ўвесну 1920 года вызваліла ўвесь Паўночны Каўказ ад белых банд.

Пасля скančэння грамадзянскай вайны Сяргей Міронавіч, будучы сакратаром ЦК комуністычнай партыі Азербайджана, аднаўляе бакінскую нафтавую прамысловасць. Разам з Серго Орджанікідзе ён прымае гарачы ўдзел у стварэнні паўночна-каўказскіх рэспублік і Закаўказскай федэрацыі народаў Каўказа.

Кіраў быў адным з членаў ЦК, пасланых партыяй пасля XIV з'езда, у снежні 1925 года, у Ленінград для барацьбы са здраднікамі і ворагамі партыі — Зіноўевым, Каменевым і інш. Разам з тт. Молатавым, Варашылавым, Калініным, Андрэевым і інш. Кіраў выступаў на фабрыках і заводах, выкрываючы буржуазныя рэстаўратарскія погляды апазіцыі. Простымі, зразумелымі і блізкімі рабочым, ён палкімі словамі бічаваў ашуканцаў партыі і рабочага класа. Ленінградскія большэвікі з захапленнем сустрэлі Кірава. Ён быў абраны першым сакратаром Ленінградскага губкома партыі.

Аж да сваёй трагічнай гібелі С. М. Кіраў кіраваў работай ленінградскіх большэвікоў. Пад яго кіраўніцтвам у Ленінградзе і вобласці ажыццяўляўся сталінскі план індустрыялізацыі. Рэканструіраваліся ленінградскія заводы, будаваліся новыя фабрыкі, электрастанцыі. Ленінградская вобласць ператварылася з спажываючай у вырабляючую. Кіраў гаварыў, што «няма такой зямлі, якая-б ва ўмелых руках пры совецкай уладзе не магла быць павернута на карысць чалавецтва». Пад яго кіраўніцтвам у далёкай хібінскай тундры, дзе раней вандравалі толькі лапары, былі пабудаваны новы горад і камбінат па распрацоўцы велізарных запасаў апатыта і нефеліна — каштоўнейшай хімічнай сыравіны.

Адной з самых выдатных большэвіцкіх якасцей Кірава былі яго глыбокія бацькоўскія клопаты аб людзях, якія будуюць сацыялізм. Ён быў ініцыятарам пабудовы вялікай колькасці новых рабочых дамоў, палацаў культуры, стадыёнаў, паркаў. Ён асабіста знаёміўся з архітэктурнымі праектамі дамоў, наглядаў за іх будаўніцтвам, выбіраў колеры для афарбоўкі дамоў.

Сяргей Міронавіч клапаціўся аб тым, каб Ленінград быў прыгожым, упарадкаваным горадам. Па яго ініцыятыве былі азеленены вуліцы на ўскраінах, заліт асфальтам булыжны брук, устаноўлены электрычныя ліхтары. Вуліцы рабочых ускраін, поўныя раней карчмаў, піўных, цэркваў, — сталі культурнымі праспектамі, з тэатрамі, палацамі культуры, скверамі.

З вялікай любоўю адносіўся Сяргей Міронавіч да дзяцей. Ён цікавіўся працай школ, дзіцячых дамоў, піонерскіх клубаў.

Кіраў быў членам ЦК, членам Палітбюро і сакратаром Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, членам прэзідыума ЦВК СССР. Ён прымаў самы актыўны ўдзел у дзяржаўнай рабоце, займаўся пытаннямі навукі, мастацтва, культуры.

Выключна ўважліва адносіўся Сяргей Міронавіч да пытанняў абароны. Умацаванне баявой і палітычнай падрыхтоўкі часцей Чырвонай Арміі, караблёў Балтыйскага флота, будаванне новых ваенных суднаў, — усё гэта было яго кроўнай справай. Ён удзельнічаў у манеўрах Балтфлота, часта наведваў заводы і верфі, чырвонаармейскія інтэрнаты.

З трыбуны XVII з'езда партыі ў апошні год свайго жыцця Кіраў сказаў: «Поспехі сапраўды ў нас велізарныя. Чорт его ведае, калі па-чалавечаму сказаць, дык хочацца жыць і жыць...»

Б'ючы ворагаў партыі, ворагаў народа, ворагаў сацыялізма, Кіраў згуртоўваў ленінградскіх большэвікоў, партыйных і непартыйных, вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта партыі, вакол Сталіна. Сяргей Міронавіч быў прасякнуты глыбокай любоўю, бязмежнай адданасцю да вялікага правадыра, настаўніка і друга працоўных таварыша Сталіна. Гэту велізарную любоў, адданасць да таварыша Сталіна Кіраў перадаў усім большэвікам, усім працоўным Ленінграда.

Цудоўнае жыццё выдатнага большэвіка было перарвана злачэйскім стрэлам 1 снежня 1934 года. Агідная банда ворагаў народа — трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў, якая знаходзілася на ўтрыманні ў замежных разведак, арганізавала і ажыццявіла злачэйскі акт, забіўшы незабыўнага С. М. Кірава. За любоў да радзімы, за беззаветную адданасць партыі, за любоў да правадыра народаў таварыша Сталіна забілі Кірава азвярэлыя, агідныя здраднікі.

Дні смутку, дні пахавання Кірава ператварыліся ў велізарную дэманстрацыю адзінства совецкага народа, дэманстрацыю беззаветнай адданасці народа большэвіцкай партыі і свайму правадыру таварышу Сталіну. Злачэйскае забойства тав. Кірава яшчэ раз напомніла аб капіталістычным акружэнні нашай краіны, аб агентуры, якую засылае да нас разведка капіталістычных краін. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна совецкі народ разграміў трацкісцка-бухарынскую банду забойцаў, шпіёнаў, шкоднікаў, дыверсантаў. Памятаючы ўказанні таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні, совецкі народ давядзе да канца разгром ворагаў сацыялістычнай радзімы.

Народы вялікага Совецкага Саюза, працоўныя ўсяго свету не забудуць ніколі С. М. Кірава. Яго вобраз будзе заўсёды жыць у сэрцах мільёнаў працоўных усяго свету.



С. М. Кіраў у Астрахані.
Гравюра на дрэве работы мастака Мачалава (Ленінград).

Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

★ ★ ★

Агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых аўтазавода імені Сталіна вылучыў кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага гарадского Совета дэпутатаў працоўных па выбарчай акрузе № 753

Іосіфа Вісарыёнавіча СТАЛІНА

Чатыры гадзіны дня. Гудок абвясціў сканчэнне работы першай змены, і адразу стала цесна на прасторным двары маскоўскага аўтазавода імені Сталіна. 30 тысяч рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода прышлі сюды на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета.

Сход адкрывае старшыня заўкома тав. А. Ф. Багачоў. Пад бурныя, працяглыя апладысменты ў пачотны прэзідыум выбіраюцца таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Хрушчоў, Берыя, Швернік. Доўга цягнецца авацыя, раздаюцца воклічы прывітанняў у часць таварыша Сталіна і яго саратнікаў.

Першым слова бярэ стары кадравік Александр Георгіевіч Суханіхін. Яго добра ведае ўвесь велізарны калектыў аўтазаводцаў.

З гарачымі прамовамі выступілі беспартыйны інжынер тэхналагічнага аддзела тав. В. П. Качэткоў і майстар-стаханавец комсамолец тав. В. А. Ліпкін. Затым ад комуністычнай арганізацыі завода выступіў сакратар парткома тав. В. І. Крэсцьянінаў.

З велізарным уздымам і натхненнем сход аднагалосна прыняў пастанову вылучыць кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета па выбарчай акрузе № 753 таварыша Сталіна.

ПАСТАНОВА

АГУЛЬНАГА СХОДА РАБОЧЫХ, ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЛУЖАЧЫХ АЎТАЗАВОДА ІМЕНІ СТАЛІНА

г. Масква. Прысутнічала 30.000 чалавек. 29 лістапада 1939 г.

Агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых аўтазавода імені Сталіна ў колькасці 30.000 чалавек, абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, пастанаўляе:

Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 753-й выбарчай акрузе гор. Масквы ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых аўтазавода імені Сталіна вернага прадаўжальніка справы Леніна, горача любімага намі правадыра працоўных СССР і ўсяго свету, творца Канстытуцыі сацыялізма — таварыша **Сталіна** Іосіфа Вісарыёнавіча, 1879 года нараджэння, генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), месцажыхарства — гор. Масква, Крэмль.

Сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых аўтазавода імені Сталіна вылучае кандыдатуру таварыша Сталіна ў дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета па 753-й выбарчай акрузе.

Галасуючы за таварыша **Сталіна**, мы будзем галасаваць за далейшы рост магутнасці нашай радзімы, за яшчэ больш шчаслівае і радаснае жыццё, за далейшыя перамогі комунізма ў нашай краіне.

Агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых аўтазавода імені Сталіна просіць таварыша Сталіна Іосіфа Вісарыёнавіча даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 753-й выбарчай акрузе.

Старшыня схода БАГАЧОЎ, члены прэзідыума: ВОЛКАЎ, ЖЫДКОЎ, ЗАХАРАЎ, КРЭСЦЬЯНІНАЎ, КУЛАГІН, ЛІПКІН, ПЕГАЎ, ПАПОЎ, СУХАНІХІН, УШКАЛАЎ, З. ФЕДАРАВА, ШМАГЛІТ.

Агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых ленінградскага завода імені Сталіна вылучыў кандыдатам у дэпутаты Ленінградскага гарадского Совета дэпутатаў працоўных па выбарчай акрузе № 332

Іосіфа Вісарыёнавіча СТАЛІНА

Дзённая змена закончана. Велізарная тэрыторыя завода імені Сталіна ажыла, запоўнілася людзьмі.

Многатысячны калектыў сталінцаў прышоў на агульназаводскі сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Ленінградскага гарадскога Совета.

Першае слова прадастаўляецца майстру механічнага цэха Івану Дэмітрыевічу Калініну.

— Я прапаную, — гаворыць т. І. Д. Калінін, — вылучыць кандыдатам у дэпутаты Ленінградскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. **(Воклічы «ура», «Няхай жыве наш любімы і родны СТАЛІН!». Гром апладысментаў эгалашае заводскую плошчу. Некалькі мінут прадаўжаецца бура авацый у часць таварыша СТАЛІНА).**

Затым выступаюць стаханавец тав. Мазін, начальнік паратурбіннага цэха ордэнаносец інжынер тав. Страупе, сакратар камітэта ВЛКСМ тав. Іваноў, дырэктар завода ордэнаносец тав. Нікіцін, сакратар парткома ордэнаносец тав. Седоў. З выключнай цеплынёй і любоўю гавораць яны аб вялікім правадыру народаў — таварышу Сталіне.

Многатысячны сход пад бурныя апладысменты прымае наступную пастанову:

«У адпаведнасці з Канстытуцыяй РСФСР і Палажэннем аб выбарах ў краявыя, абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных, агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода імені Сталіна вылучае кандыдатам у дэпутаты Ленінградскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных таварыша Сталіна Іосіфа Вісарыёнавіча — генеральнага сакратара ЦК Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў, 1879 года нараджэння, пражываючага ў г. Маскве, Крэмль, і просіць таварыша І. В. Сталіна даць сваю згоду балатыравацца па 332 выбарчай акрузе па выбарах у Ленінградскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных».

З велізарным уздымам і натхненнем агульназаводскі сход паслаў таварышу Сталіну тэлеграму, у якой просіць даць згоду балатыравацца ў Ленінградскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных па 332 выбарчай акрузе Краснагвардзейскага раёна горада Леніна.

Агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых камбіната Трохгорнай мануфактуры імені Ф. Э. Дзержынскага вылучыў кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага гарадского Совета дэпутатаў працоўных па выбарчай акрузе № 724

Вячэслава Міхайлавіча МОЛАТАВА

Работа дзённай змены закончана. Звыш 5.000 рабочых і работніц, інжынераў і тэхнікаў, майстроў і служачых сабраліся на двары паміж фабрычных карпусоў у чаканні адкрыцця прадвыбарчага схода. Святочна выглядаюць сцены старых карпусоў. Яны ўпрыгожаны лозунгамі і партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада. Ажыўлена гутараць рабочыя. Грае аркестр.

Прадвыбарчы сход пачаўся. Пад бурныя апладысменты выбіраюцца ў пачотны прэзідыум таварыш Сталін і яго слаўныя саратнікі—таварышы Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Хрушчоў, Берыя і Швернік.

Пад бурныя апладысменты аднагалосна прымаецца пастанова — вылучыць кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета таварыша Молатава.

ПАСТАНОВА

АГУЛЬНАГА СХОДА РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ, ІНЖЫНЕРАЎ, ТЭХНІКАЎ І СЛУЖАЧЫХ КАМБІНАТА ТРОХГОРНАЙ МАНУФАКТУРЫ ІМЕНІ Ф. Э. ДЗЕРЖЫНСКАГА

г. Масква. Прысутнічала 5.150 чалавек. 29 лістапада 1939 года

Агульны сход рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых камбіната Трохгорнай мануфактуры імені Ф. Э. Дзержынскага, абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, пастанаўляе:

1. Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 724 выбарчай акрузе г. Масквы ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых камбіната Трохгорнай мануфактуры імені Ф. Э. Дзержынскага — вернага і непахіснага вучня Леніна і Сталіна, палкага і стойкага барацьбіта за справу комунізма, бязмежна любячага свой народ і бязлітаснага да яго ворагаў, бліжэйшага друга і саратніка вялікага **Сталіна**, главу Совецкага Ўрада і Народнага Камісара Замежных Спраў **Молатава** Вячэслава Міхайлавіча, 1890 года нараджэння, члена ВКП(б), пражываючага ў горадзе Маскве, Крэмль.

2. Агульны сход просіць таварыша Вячэслава Міхайлавіча **Молатава** даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 724 выбарчай акрузе гор. Масквы ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых камбіната Трохгорнай мануфактуры імені Ф. Э. Дзержынскага.

Старшыня схода МЕНЬШЫКАЎ.

Сакратар ФЕЦІСАВА.

Члены прэзідыума: МАКАРАЎ, УХОЛІН, КУЗНЕЦОЎ, ПАПОВА, ГРАНАТКІН, БІВЕР, САЛАМАЦІНА, СКВІРЭНКО, ОСПЕНІКАВА, ІВАНОВА, КАМІСАРАВА, КУЗНЕЦОВА.

(ТАСС).

В. М. Молатаў вылучан кандыдатам у дэпутаты Ленінградскага гарадского Совета дэпутатаў працоўных на прадвыбарчым сходзе калектыва ордэнаноснага завода „Светлана“

Тысячы працоўных ордэна Леніна завода «Светлана» прышлі на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Ленінградскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты сход прымае наступную пастанову:

«Кандыдатам у дэпутаты Ленінградскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 115 выбарчай акрузе ад рабочых, работніц інжынераў, тэхнікаў і служачых ордэна Леніна завода «Светлана» вылучыць Старшыню Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў Саюза ССР таварыша Молатава Вячэслава Міхайлавіча, 1890 года нараджэння, члена ВКП(б), пражываючага ў Маскве. Прасіць таварыша В. М. Молатава даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Ленінградскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 115 выбарчай акрузе г. Ленінграда».

Пісьменнікі—кандыдаты ў дэпутаты Советаў

28 лістапада пісьменнікі БССР і супрацоўнікі апарата ССПБ вылучалі сваіх кандыдатаў у дэпутаты гарадскога і раённага советаў. Сход адкрыў Ю. Рудзько.

Слова атрымлівае народны паэт Якуб Колас:

—Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты ў Мінскі гарадскі совет па 208 выбарчай акрузе народнага паэта Янку Купалу. Купалу ведае не толькі Беларусь, яго песні спяваюцца ўсімі народамі СССР.

Прапанова тав. Коласа прымаецца аднагалосна.

—Ад шчырага сэрца дзякую за давер'е,—кажа тав. Купала,—буду аддана служыць народу, які я вечна любіў і буду вечна любіць.

Прапанову аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога совета па 298 выбарчай акрузе пісьменніка-ордэнаносца Змітрака Бядулі ўносіць тав. Стаховіч:

—Бядуля з'яўляецца адным з лепшых пісьменнікаў БССР. Яго творы добра вядомы совецкаму чытачу, па іх вучацца майстэрству нашы маладыя пісьменнікі

Сход аднагалосна вылучае Зм. Бядулю кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога совета.

Слова бярэ паэт-ордэнаносец Пятро Глебка:

—Кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога совета па 341 выбарчай акрузе я прапаную вылучыць пісьменніка-комуніста Міхася Лынькова. Міхась Лынькоў даказаў сваю адданасць вялікай справе партыі Леніна—Сталіна.

Агульны сход згаджаецца з прапановай тав. Глебкі—тав. Лынькоў вылучаецца кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога совета.

Слова для прапановы мае тав. Камянецкі:

—Кандыдатам у дэпутаты Сталінскага раённага совета я прапаную вылучыць таленавітага яўрэйскага пісьменніка Уры Фінкеля.

Пісьменнікі БССР ацанілі па дастойнству вялікую работу тав. Фінкеля, вылучыўшы яго кандыдатам у дэпутаты Сталінскага раённага совета па 72 выбарчай акрузе.

Прапанову аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Сталінскага раённага совета па 95 выбарчай акрузе тав. Кузьмы Чорнага ўносіць тав. Гурскі. Тт. Броўка і Бярозкін падтрымалі прапанову тав. Гурскага. Сход аднагалосна далучаецца да іх.

Даверанымі асобамі сход выбірае т. т. Э. Кагана, Хв. Шынклера, А. Якімовіча, А. Кучара і Г. Бярозкіна.

★ ★ ★

ЯНКА КУПАЛА

Народны паэт БССР, славуты майстар мастацкага слова Я. Купала сваёй шырокай грамадскай дзейнасцю і сваёй каштоўнейшай творчасцю кроўна і непарыўна звязан з жыццём і лёсам народа.

У сялянскай хаце, у сям'і беззямельнага арандатара, у фальварку Вязынка Вілейскага павета б. Віленскай губерні, нарадзіўся ў 1882 годзе Іван Дамінікавіч. Горкім было дзяцінства таленавітага сялянскага хлапчука, цяжкім было яго юнацтва. Будучаму паэту яшчэ з маленства была вядома цяжкая праца на «чужых». «Трэба было, — успамінаў значна пазней Купала, — працаваць на памешчыка, уласніка той зямлі, якую я павінен быў пахаць і засяваць».

Да 1904 года Іван Дамінікавіч жыве разам з бацькамі і працуе на сельскай гаспадарцы. Пасля смерці бацькі (1904 год) Купала адпраўляецца «ў людзі» і працуе каля трох год у якасці чорнарабочага на панскіх броварах, жывучы ва ўмовах беднасці і нястрымнай эксплаатацыі. Увосень 1908 года Купала, ужо вядомы к гэтаму часу беларускай грамадскасці як таленавіты паэт, пераязджае ў Вільню. Прыватнымі ўрокамі, бібліятэчнай працай лепшы прадстаўнік беларускай інтэлігенцыі вымушан быў здабываць сродкі для поўгалоднага існавання.

Івану Дамінікавічу ўласціва незвычайная працаздольнасць. Ён упарта, настойліва і няспынна працаваў над сабою. На некаторы час Купала выязджае з Вільні ў Пецербург, дзе яму ўдаецца паступіць на агульнаадукацыйныя курсы, на якіх пісьменнік займаўся чатыры зімы і скончыў іх. У 1913 годзе, прыехаўшы з Пецербурга ў Вільню, Іван Дамінікавіч працуе адказным рэдактарам «Нашай нівы». У 1915 годзе, у сувязі з наступленнем немцаў, Купала эвакуіруецца спачатку ў Орол, а потым у Маскву. І толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя, вызваліўшая беларускі народ, прынесла і яго паэту сапраўды радаснае, вольнае і чалавечае жыццё.

У перыяд рэвалюцыйнай грозы, у баявым 1905 годзе, упершыню прагучалі пудоўныя і хвалюючыя песні паэта з народа. У мінскай газеце «Северо-западный край» у маі 1905 года быў надрукован першы верш Купалы — «Мужык», накіраваны рэзка і прама супроць мярзотнасці тагочаснай царскай рэчаіснасці. Любячы жыццё, поўны веры ў лепшае будучае народа, пратэстуючы супроць нечалавечых умоў жыцця працоўных мас сваёй шматпакутнай радзімы, паэт-юнак вуснамі мужыка галасна ў першым сваім вершы заявіў:

> І кожны, хто мяне спытае,
> Пачуе толькі адзін крык:
> Што хоць мной кожны пагарджае,
> Я буду жыць, — бо я мужык!

Выхадзец з народа, верны сын сваёй радзімы, Я. Купала заняў адно з пачэсных месц у сусветнай рэволюцыйна-дэмакратычнай літаратуры.

Паэзія Купалы, якая вырасла на глебе многавяковага багацця народнай творчасці і класічнай рускай літаратуры, увабрала ў сябе лепшыя імкненні і думы, пачуцці і мары беларускага народа і ўвасобіла іх у чароўных па сваёй сіле і абаяльнасці мастацкіх вобразах. У вершы «Чаго-б я хацеў» ідэя служэння народу, як асноўнае прызначэнне паэзіі, выражана пісьменнікам са здзіўляючай паўнатой:

> Дык-жа знайце, чаго-б я хацеў,
> Аб чым думачкі толькі мае:
> Каб мой люд маю песню запеў,
> І пазнаў, аб чым песня пяе.

Сам народ і з'яўляецца асноўным і галоўным героем купалаўскай паэзіі. Купала ў сваёй дакастрычніцкай творчасці адлюстраваў у маляўнічых вобразах самыя разнастайныя бакі жыцця прыгнечанага народа, багатую і складаную гаму народных адчуванняў, дум і перажыванняў, цудоўныя абразкі беларускай прыроды.

Да Я. Купалы ніхто ў беларускай літаратуры з такой глыбінёю і праўдзівасцю не паказаў неймаверных пакут і гора,



якія перажывалі працоўныя масы Беларусі пад гнётам цара, памешчыкаў і капіталістаў. Як жывы дакор усяму капіталістычнаму ладу, устаюць з паэтычных тварэнняў Купалы поўнакроўныя карціны народнага жыцця і вобразы абяздоленых людзей.

Такія творы Купалы, як «Курган», «Бандароўна», «Зімою», «Град» і шмат іншых, з'яўляюцца мастацкімі дакументамі, якія выкрываюць і характарызуюць брудны і цёмны свет бяздзелля, прагных інтарэсаў, скнарнасці, фальшы і крывадушнасці класавага грамадства.

Купала—паэт-бунтар, прама і бязлітасна граміў катаў народа. У народных масах Купала бачыў магутную сілу, здольную зруйнаваць стары парадак і пабудаваць вольнае жыццё. Пісьменнік заклікаў народ на рэволюцыю і ў сваіх паэтычных песнях уславіў магутную барацьбу народа за сваё вызваленне.

> Зямлёй лягу ў зямлю,
> Але перш прапяю,
> Як я волю люблю,
> Гэту волю сваю! —

заяўляе лірычны герой у вершы «Воля». Многія творы дакастрычніцкай пары славутага паэта прасякнуты ідэяй народнай рэволюцыі. У вядомым творы «А хто там ідзе?» паэт стварае вобраз вялікага сацыяльнага гучання, вобраз прыгнечанай Беларусі, якая паднімаецца на барацьбу за волю.

> А хто гэта іх, не адзін мільён,
> Крыўду несць навучыў, разбудзіў іх сон?
> —Бяда, гора.
> А чаго-ж, чаго захацелася ім,
> Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
> —Людзьмі звацца.

Складаючы свае рэволюцыйныя песні ў змрочныя часы царызма, ва ўмовах лютай царскай цэнзуры, Купала часам губляў дарогу, станавіўся на няправільны шлях, але ў такіх выпадках на дапамогу яму прыходзіў народ. Творчасць Купалы аказала велізарны станоўчы ўплыў на развіццё ўсёй паслядуючай беларускай літаратуры.

Ва ўмовах совецкай рэчаіснасці асабліва расквітнеў цудоўны талент народнага паэта. Перажыўшы часовыя ідэйныя хістанні і хутка перамогшы іх, Купала становіцца першакласным майстрам мастацкага слова ў літаратуры народаў СССР, буйнейшым прадстаўніком сацыялістычнай беларускай паэзіі, песняром сацыялізма.

За годы совецкай улады ў творчасці Купалы адбыліся істотныя якасныя змены. Значна пашырыўся тэматычны дыяпазон купалаўскай паэзіі ў параўнанні з творчасцю дакастрычніцкай пары, яна абагацілася новымі матывамі, вобразамі.

У шматграннай і разнастайнай лірыцы народнага паэта знайшлі сваё адлюстраванне асноўныя этапы слаўнага гістарычнага шляху, па якому беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі прышоў да велізарнейшых перамог сацыялізма.

Песні Купалы, агорнутыя рэволюцыйным пафасам, сацыялістычным патрыятызмам, гарачай любоўю і адданасцю да комуністычнай партыі і радзімы, перадаюць веліч сталінскай эпохі, веліч і грандыёзнасць спраў і дум сацыялістычнага чалавека. Надоўга застануцца ў памяці чытача выразныя лірычныя вобразы совецкіх людзей — гераічных і смелых, паказаных у шматлікіх творах Купалы: «Дзве сястры», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Выпраўляла маці сына», «Сыны» і г. д. У такіх вершах Купалы, як «Табе, правадыр», «Беларусь ордэнаносная», «Сталінскія арляняты» «Нашаму святу» і г.д. пісьменнікам створаны мастацка-поўнацэнныя лірычныя вобразы, — змрочныя вобразы мінулага Беларусі і сонечныя вобразы Беларусі сацыялістычнай.

У мінулым Беларусь — край цемры і адсталасці, дзе панаваў страшэнны сацыяльны прыгнёт і народная нядоля. Успамінаючы мінулае, паэт малюе змрочныя вобразы Беларусі:

> Чым ты была, Беларусь мая родная,
> Хіба-ж не бачылі нашыя вочы —
> Вечна абдзёртая, вечна галодная,
> Сонца не ведала, а толькі ночы.
> Людзі твае, ў беднаце гадаваныя.
> З торбай жабрацкай век дажывалі...
> Злосна стагналі вятры над курганамі,
> Хмары насіліся чорнаю хваляй...

З паэтычных радкоў песень Купалы вырастае мастацкі вобраз новай, адроджанай Кастрычнікам Беларусі — маладой краіны.

> Паўстала радзіма. Замок
> Няволі зламала навек,
> Надзела з пралесак вянок
> І слёзы сагнала з павек.

Супастаўляючы мінулае і сучаснае ў жыцці свайго народа, паэт накіроўвае лепшыя думы і пачуцці да таго, хто даў сапраўды чалавечае жыццё беларускаму народу, накіроўвае да таварыша Сталіна:

> Мы ідзём у сонца, з сонцам
> маладым паходам.
> Слава бацькаўшчыне нашай
> І яе народам.
> Слава сокалу, што родам
> З-пад каўказскіх скалаў,
> Што з Крамля праменні сее
> З юнацкім запалам.

Высокая ідэйнасць, праўдзівасць, мастацкая пераканальнасць, свежасць і арыгінальнасць паэтычных вобразаў, багацце паэтычнай мовы, дасканаласць формы —асноўныя ўласцівасці сацыялістычнай лірыкі Купалы.

Купала з'яўляецца актыўным членам праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і членам праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР, акадэмікам Акадэміі навук БССР і акадэмікам Акадэміі навук УССР.

У 1925 годзе ўрад сацыялістычнай Беларусі надаў Купалу годнасць народнага паэта БССР, у 1939 годзе Янка Купала ўзнагароджан ордэнам Леніна.

Народны паэт БССР Іван Дамінікавіч Купала—дастойны кандыдат у дэпутаты Мінскага гарадскога совета дэпутатаў працоўных.

В. БАРЫСЕНКА.

Уры Фінкель

Сярод пісьменнікаў — кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных мы сустракаем і імя яўрэйскага пісьменніка Уры Фінкеля. Агульны сход пісьменнікаў БССР і адміністрацыйна-тэхнічных працаўнікоў ССПБ аднадушна вылучыў У. Фінкеля кандыдатам у дэпутаты Сталінскага раённага совета.

Уры Фінкель, яўрэйскі совецкі пісьменнік БССР, нарадзіўся ў 1896 годзе ў мястэчку Ракаў былой Мінскай губерні.

Тут, у асяроддзі мяснікоў, балаголаў і рамеснікаў з маленства палюбіў ён яўрэйскую народную песню, тут навучыўся ён багатай, маляўнічай і гучнай мове яўрэйскіх народных мас.

Дзіцячыя годы свае ён правёў у хедэры, вывучаючы біблію і талмуд.

Надышоў 1905 год. У шматлікіх майстэрнях мястэчка, дзе выраблялiся драўляныя сельскагаспадарчыя машыны, рабочыя спявалі рэволюцыйныя песні. Гучэлі гэтыя песні і сярод мястэчковай беднаты. Трапілі яны таксама і ў хедэр. Хлапчукі спявалі іх у вузкіх і пыльных ракаўскіх завулках, у хатах і нават у хедэры.

Навакольныя падзеі ўплываюць на свядомасць юнака. Ён адмаўляецца пасля сканчэння хедэра ад далейшай клерыкальнай адукацыі і з прагнасцю чытае свецкія кнігі ў мястэчковай бібліятэцы. У 14-гадовым узросце ён авалодвае рускай мовай. Здаўшы экстэрнам іспыты за 6 класаў рэальнага вучылішча, Уры Фінкель паступае ў 1915 годзе ў Харкаўскае палітэхнічнае вучылішча, а ў 1917 годзе—на першы курс Палітэхнічнага інстытута.

У 1918—19 годзе ён працуе ў Маскве, у Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей. У канцы 1919 года ён ідзе добраахвотнікам у Чырвоную Армію. У палітаддзеле арміі ён працуе сакратаром рэдакцыі штодзённай газеты «Красноармеец», потым адказным арганізатарам па агітацыі і прапагандзе сярод яўрэйскага насельніцтва прыфрантавой паласы. У 1920 годзе, у часы наступлення Чырвонай Арміі на Варшаву, тав. Фінкель з'яўляецца адказным рэдактарам газеты «Роста» на яўрэйскай мове і газеты «Комуна».



Пасля дэмабілізацыі ён працуе ў Мінску, у газеце «Октябр». З гэтага часу пачынаецца сталая літаратурная дзейнасць Фінкеля. З 1927 па 1930 год ён вучыцца ў аспірантуры Беларускай акадэміі навук, з 1932 па 1938 г. выкладае гісторыю і тэорыю яўрэйскай літаратуры ў Вышэйшым педагагічным інстытуце.

У 1926 годзе Уры Фінкелем была напісана сумесна з Н. Ослендэрам кніга пра А. Гольдфадэна, класіка яўрэйскай драматургіі. Кніга вышла ў выданні Беларускай акадэміі навук. Адначасова з гэтым У. Фінкель апублікаваў у яўрэйскім зборніку Акадэміі навук дослед «Драматургія Гольдфадэна».

Яму належыць таксама рад крытычных артыкулаў і доследаў аб яўрэйскім крытыку Балмахшовес, аб творчасці яўрэйскіх совецкіх паэтаў Фефера, Маркіша і Квітко, пераклады на яўрэйскую мову навуковых прац акадэміка Н. Нікольскага і інш.

У апошні час У. Фінкелем напісаны біяграфічныя аповесці «Мендэлэ Мойхер-Сфорым» і «Шолам-Алэйхем». Абедзве гэтыя кнігі вышлі ў свет у выданні Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі (на яўрэйскай і беларускай мовах) і ў выдавецтве «Эмес» у Маскве.

Паслядоўна апавядаючы ў сваёй кнізе пра жыццёвы і творчы шлях Шолам-Алэйхема, Уры Фінкель характарызуе адначасова і стан тагочаснага грамадства, у асяроддзі якога жыў і дзейнічаў вялікі яўрэйскі пісьменнік. Даволі падрабязна спыняецца аўтар і на крытычным аналізе творчасці Шолам-Алэйхема.

Уры Фінкель добра ведае жыццё яўрэйскіх народных мас. Творы яго і, асабліва, «Мендэлэ Мойхер-Сфорым», багата насычаны фальклорам, маляўнічымі бытавымі зарысоўкамі, трапнымі характарыстыкамі, гістарычнымі і этнаграфічнымі дэталямі. Жыццё яўрэйскіх народных мас у гарадах і мястэчках Беларусі і Украіны у другой палове XIX стагоддзя з'яўляецца тым фонам, на якім разгортвае аўтар у белетрыстычнай форме біяграфію класіка яўрэйскай літаратуры Мендэлэ Мойхер-Сфорыма. Перад чытачом — маляўнічыя вобразы яўрэйскіх народных мас у Капылі, Слуцку, Вільне, на Украіне.

Аўтар яскрава паказвае чытачу тыя сацыяльна-гістарычныя працэсы, якія абумовілі распад яўрэйскага феадальна-рабінскага грамадства і нараджэнне новых капіталістычных адносін у гарадах і мястэчках былой царскай Расіі. У жывых і каларытных малюнках раскрывае Фінкель перад чытачом сацыяльныя супярэчнасці ў яўрэйскім асяроддзі, барацьбу яўрэйскіх працоўных мас супроць неабмежаванага ўціску кіраўнікоў кагалу — клерыкалаў, ліхвяроў і адкупнікаў, верных саюзнікаў і дапаможнікаў царызма ў справе заняволення народных мас.

Творы Фінкеля напісаны жывой і выразнай мовай, яны маюць бясспрэчна вялікае пазнавальнае значэнне.

В. ВОЛЬСКІ.

І. А. КРЫЛОЎ

Літаратурная дзейнасць І. А. Крылова пачалася ў канцы XVIII стагоддзя.

Ужо ў першым яго творы—камічнай оперы «Кафейніца» (1784 год) выявіліся многія характэрныя асаблівасці яго творчасці.

У 1789 годзе Крылоў разам з другімі літаратарамі выдае сатырычны журнал «Почта духов». Журнал праіснаваў каля года. У 1792 годзе Крылоў зноў выдае сатырычны журнал «Зритель», які праіснаваў таксама толькі адзін год. У 1793 г. ён зноў выдае журнал «Санктпетербургский меркурий».

У творах, надрукаваных у памянёных журналах, Крылоў вельмі дасціпна і едка высмейваў заганы дваранска-чыноўнічага асяроддзя.

У сваіх вострых сатырах ён многа аддаваў увагі марнатраўству, захапленню модамі, французаманіі дваранства. Але Крылоў умеў на паказе гэтых, на першы погляд, дробных заганаў дваранскага асяроддзя ставіць сур'ёзныя праблемы соцыяльнага парадку.

Высмейваючы французаманію, ён асуджаў агідныя адносіны дваранства да свайго народа і рускай народнай мовы. У гэтым выяўляўся патрыятызм Крылова.

Выключную славу Крылоў набыў сваімі байкамі. Ужо ў 1788 годзе Крылоў надрукаваў некалькі баек у журнале «Утренние часы». Аднак-жа свае байкі ён пісаў галоўным чынам у апошні перыяд сваёй дзейнасці, пачынаючы з 1805 і канчаючы 1835 годам. Усяго ён напісаў каля 200 баек. Вельмі высока ацаніў іх Белінскі. «Байкі Крылова, — пісаў ён— скарбніца рускага практычнага розума, рускай дасціпнасці і гумару, рускай разгаворнай мовы; яны вылучаюцца і прастадушнасцю і народнасцю».

У сваіх байках Крылоў выкрываў драпежніцтва чыноўнікаў, крытыкаваў грамадска-палітычны лад. Чыноўнікаў і ваяводаў Крылоў рысаваў у выглядзе драпежных ваўкоў, шчук і хітрых лісіц. У радзе баек Крылоў рысуе адмоўнымі фарбамі вобразы пароў («Лягушкі, просячыя цара», першы варыянт байкі «Рыб'і пляскі» і інш.).

Асмейванню сістэмы дзяржаўнага ўпраўлення прысвечаны байкі: «Лягушкі, просячыя цара», «Мірская сходка», «Квартэт», «Мор звяроў», «Сяляне і рака» і інш.

У байцы «Квартэт» Крылоў высмейвае дзяржаўны савет. У байцы «Ваўкі і авечкі» выкрываецца дзяржаўнае заканадаўства, выгоднае для драпежнікаў-правіцеляў і згубнае для народа.

Выкрыццю суда і судзейскіх парадкаў прысвечаны байкі «Шчука», «Селянін і авечка», «Мядзведзь у пчол», «Ваўкі і авечкі» і інш.

Адмоўныя адносіны да класа дваранства асабліва рэзка выражаны ў байцы «Гусі». У ёй Крылоў гаворыць аб бескарыснасці і непатрэбнасці дваранскага класа. Аналагічныя матывы мы знойдзем і ў байцы «Лісце і карэнне».

Свае сімпатыі Крылоў звязваў з народам. Ён паказаў высокія душэўныя якасці народа. У байцы «Воўк на псарні» Крылоў расказаў аб народным патрыятызме, аб здольнасцях народа на гераізм у імя абароны радзімы.

Працавітасць народа Крылоў супрацьстаўляў паразітызму правячага дваранскага класа. Апошняе мы наглядаем і ў байцы «Лісце і карэнне». У байцы «Стары і тры маладыя» Крылоў апісвае пасадзіўшага яблыні старога, якому не суджана дачакацца пладоў. Але стары не думае аб гэтым. Сваёй працай ён хоча прынесці карысць іншым людзям.

Ва ўсім гэтым выяўляліся дэмакратычныя тэндэнцыі ў творчасці Крылова.

Сам Крылоў у сваіх байках глядзеў на свет вачыма народа. Усё гэта і рабіла Крылова народным мастаком. «Крылоў— паэт народны пісьменнік», — пісаў Белінскі.

Народнасць Крылова сказалася ў своеасаблівасці яго стыля, мастацкага метада, своеасаблівасці яго майстэрства, моўных сродкаў.

У сваіх творах і, перш за ўсё ў байках, Крылоў з выдатным майстэрствам змог перадаць спецыфіку народнай мовы. Ён карыстаецца народным слоўнікам і народнымі выразамі і вобразамі, пагаворкамі і прыказкамі. У сваю чаргу шматлікія крылоўскія выразы, якія ўжываюцца ім у байках, зрабіліся «крылатымі словамі», яны моцна ўвайшлі ў разгаворную і літаратурную мову рускага народа.

Белінскі пісаў аб мове крылоўскіх баек: «І ўсё гэта выражана ў такіх арыгінальна-рускіх, неперадаваемых ні на якой мове ў свеце вобразах і зваротах; усё гэта яўляе сабою такое невычарпальнае багацце ідзіем, русізмаў, якія складаюць народную фізіяномію мовы, яе арыгінальныя сродкі і самабытнае, самароднае багацце, што сам Пушкін не поўны без Крылова ў гэтых адносінах».

Байкі Крылова, як і ўся яго творчасць, назаўсёды ўвайшлі ў скарбніцу нашай соцыялістычнай культуры.

Н. ЗЕЛЕНОЎ.

ШМАТ ВЫПАДКОВАГА

Складзены Юндзетсектарам ДВБ план выдання дзіцячай літаратуры на 1940 год патрабуе, на маю думку, значных змен.

Амаль $^{2}/_{3}$ плана па назвах і звыш $^{3}/_{4}$ па лістажу адводзіцца літаратуры для сярэдняга і старэйшага ўзростаў, прычым, львіная доля—для старэйшага. А, як вядома, у нас асаблівы голад адчуваецца іменна на кніжкі для дашкольнага, потым малодшага і сярэдняга ўзростаў. Дзеці старэйшага ўзросту чытаюць не толькі дзіцячую літаратуру. Ім ужо даступны выданні ўсіх сектараў і выдавецтваў, і яны больш чым другія ўзросты забяспечаны кнігамі.

З 29 намечаных кніг для дашкалят не больш палавіны можна назваць сапраўды дашкольнымі. Рэшта—выпадкова трапіўшыя сюды назвы.

Тэматыка дашкольных кніжак зусім беднная. За выключэннем двух кніжак, прысвечаных Чырвонай Арміі, у гэтым раздзеле нічога няма аб нашай сучаснасці

Вельмі абмежавана і тэматыка раздзела для малодшага ўзросту. Кнігі Вадап'янава, Байдукова, Тайца, Барто—вось і ўсё, што звязвае гэтыя раздзелы з нашай сучаснасцю. Пры гэтым трэба адзначыць, што кніга Вадап'янава «Полюс» больш падыходзіць для дзяцей сярэдняга ўзросту, а кніга Тайца «Антон і Антонаўна»—адна з слабых кніг гэтага аўтара.

Для сярэдняга і старэйшага ўзростаў намечана перавыдаць рад кніг з беларускай і рускай класічнай літаратуры. Гэтыя кнігі разлічаны галоўным чынам для школьнай бібліятэкі. Сюды ўваходзяць: «Тарас на Парнасе», «Энеіда навыварат», творы Багушэвіча, Багдановіча, Цёткі, Купалы і г. д. З рускіх класікаў—Талстой, Лермантаў, Некрасаў, Чэхаў, Горкі. Гэта ўсім вядомыя творы і аўтары; праўда, некаторыя творы з старой беларускай літаратуры даўно чакаюць перавыдання.

Аднак, зусім слушна метадысты Наркамасветы назвалі на нарадзе па абмеркаванню плана яшчэ дзесяткі кніг і аўтараў, якіх-бы яны хацелі бачыць у плане. Ім адказвалі, што частка названых кніг друкуецца сектарам ДІМ. Ці не лепш было-б тады школьную бібліятэку выдаваць аднаму якому сектару па аднаму строга прадуманаму плану?

У плане ёсць шмат і вартаснага ў сэнсе выбара кніг і аўтараў, але ў ім яшчэ шмат і выпадковага, як след не прадуманага.

А. ЯКІМОВІЧ.



Кадр з другой серыі фільма «Вялікі грамадзянін». Артыст-ордэнаносец **Н. Багалюбаў** у ролі Шахава (злева) і артыст **Г. Сямёнаў** у ролі Калеснікава.

БАЯВАЯ ДРУЖБА

Дружба байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі з совецкімі акторамі—старая традыцыйная баявая дружба.

Сустракаючыся з байцамі Чырвонай Арміі, а таксама ў штодзённай сваёй рабоце сярод байцоў, совецкія акторы паказвалі гатоўнасць пры першых гуках труб быць сярод перадавых часцей.

Гэтак яно і здарылася. Шчырыя запэўненні практычнаператварыліся ў жыццё.

Верныя сваёй партыі і совецкаму ўраду, на світанні 17 верасня палкі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі грознай лавінай, змятаючы на шляху ўсё, што магло-б затрымаць іх гістарычны марш, выступілі на вызваленне прыгнечаных народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны—кроўных братоў, змардаваных турэмным рэжымам польскай дзяржаўнасці.

І вось, у абставінах імклівага марша, на кароткіх прывалах, у першыя дні паходаў і баявых стычак паявіліся артысты. Яны прывезлі з сабою совецкае майстэрства лепшага ў свеце, дасканалейшага ў свеце мастацтва, каб аддаць яго байцам, якія, не ведаючы стомы, імкнуліся наперад да выканання загада свайго палкаводца — Наркома абароны Саюза ССР таварыша Варашылава.

17 верасня надвячоркам ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі пад кіраўніцтвам тав. Усачова даваў у часцях, на бівуаках першыя канцэрты. І выступленні гэтыя прымалі не толькі байцы Чырвонай Арміі, але і насельніцтва вызваляемай ад панскага гнёта мясцовасці— нашы кроўныя браты-беларусы.

18 верасня, уздзень, Дзяржаўны ансамбль народнага танца СССР, пад кіраўніцтвам засл. арт. І. Маісеева, даваў свой першы канцэрт.

Гэта былі канцэрты ў полі, у сапраўдных баявых абставінах.

Ці варта апісваць, якім глыбокім было брацкае еднанне байца-чырвонаармейца з байцом-артыстам? Гэта зразумела і без слоў. Байцы ішлі далей хуткім маршам; артысты, закончыўшы выступленні, ішлі разам з імі, не адрываючыся ад перадавых часцей, гатовыя майстэрства спевака ці танцора змяніць на вінтоўку і біць, дабіваць панскую нечысць.

Совецкая песня і чырвонаармейская пляска як-бы акрылялі поспехам дзеянні баявых часцей, ішлі нага ў нагу з баявымі калонамі.

З узброенай Чырвонай Арміяй ішла і высокая культура совецкай краіны. У адным населеным пункце пасля выступлення чырвонаармейскага ансамбля старая Сара Шмулевіч, хвалюючыся ад радасці, голасна сказала: «Якая Чырвоная Армія, такія і артысты. Дзеці мае, жыць вам усім на 100 год на нашу радасць і шчасце». Многія заяўлялі, што совецкая песня сагравае душу змардаванага панамі народа.

Шэфскае абслугоўванне РСЧА саюзам работнікаў мастацтваў у перыяд ваенных дзеянняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі было арганізавана ў вялікіх памерах. Усяго было праведзена ў часцях Дзейнічаючай арміі 298 канцэртаў, дзесяткі спектакляў і г. д. Відныя прадстаўнікі совецкага мастацтва, як нар. артыст, дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР Чаркасаў, нар. артыст Бабачкін, нар. артыст СССР Добранраваў і рад іншых прынялі актыўны ўдзел у шэфскай рабоце па абслугоўванню часцей і насельніцтва. Акторы жылі адной дружнай сям'ёй з байцамі і камандзірамі, пераносілі ўсе цяжкасці паходна-бівуачнага жыцця і пры неабходнасці бралі ў рукі зброю.

Непараўнальна прыемныя рамансы Чайкоўскага і магутная, заклікаючая наперад, перамагаючая ўсё совецкая песня— гэта кампаненты ўзбраення, баявая зброя высокакультурнага байца Чырвонай Арміі. Цікава работа кампазітара Блантэра. Вершы В. Лугаўскога і Е. Далматоўскага былі пакладзены Блантэрам, у часе яго знаходжання ў часцях Беларускага фронта, на музыку і праз тры дні пасля паяўлення ў чырвонаармейскім друку іх ужо распявалі перад чырвонаармейскай аўдыторыяй спевакі эстрадных брыгад.

Новае ў абслугоўванні часцей Чырвонай Арміі, чаго не ведала грамадзянская вайна—гэта работа ў франтавых умовах калектываў профсаюзнай самадзейнасці. Калектывы мінскіх клубаў будаўнікоў, швейнікаў, харчавікоў выдатна справіліся з гэтай ганаровай задачай. Добра ва ўмовах поля прымаліся канцэрты брыгад студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Традыцыі старой дружбы паміж саюзам работнікаў мастацтваў і РСЧА ўмацаваны яшчэ больш. Яны сведчаць аб любві народа краіны Советаў да Чырвонай Арміі, аб гатоўнасці совецкага актора аддаць сваё мастацтва вялікай справе—абароне радзімы.

Влад. МУРАТ.

ХАЛГАСНЫ ТЭАТР АБСЛУГОЎВАЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Рагачоўскі калгасна-соўгасны тэатр актыўна ўдзельнічае ў выбарчай кампаніі. Тэатр падрыхтаваў канцэртную праграму, прысвечаную выбарам, правёў ужо 10 выездаў у калгасы Рагачоўскага раёна, дзе былі абслужаны канцэртамі выбаршчыкі.

На агульным сходзе работнікі тэатра аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты Рагачоўскага горсовета дэпутатаў працоўных дырэктара тэатра тав. І. Гульмана.

Б. САВІЧ.

АБМЕРКАВАННЕ СПЕКТАКЛЯ „ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ“

25 лістапада ў Доме пісьменніка адбылося абмеркаванне апошняй работы Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра—спектакля «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы.

У абмеркаванні прынялі ўдзел пісьменнікі, крытыкі, работнікі тэатра і мастакі.

Першым выступіў тав. В. Вольскі. Ён даў высокую ацэнку спектаклю, адзначыўшы глыбокую і дэталёвую сцэнічную распрацоўку яго, наяўнасць ансамбля. З выканаўцаў,—гаворыць тав. Вольскі,— асабліва вялікае ўражанне пакідае засл. арт. рэсп. Глебаў у ролі Тулягі. Гэты вобраз вельмі арганічны і пераканаўчы. Ён створан акторам з пачуццём меры і сцэнічнага такту. У гэтай ролі Г. Глебаў з новай сілай паказаў сваё выдатнае майстэрства пераўвасаблення. Добра вядзе ролю Нічыпара засл. арт. рэсп. Г. Грыгоніс. Глыбокі вобраз стварае засл. арт. рэсп. Л. Рахленка ў ролі Гарлахвацкага. Але тав. Рахленка залішне прастадінейна вядзе сваю ролю. Было-б лепш, калі-б ён іграў без залішняга падкрэслівання якасцей персанажа.

П'еса карыстаецца заслужаным поспехам у гледача. Гэты поспех абумовілі яе камедыйная вастрыня і актуальнасць. Але ў п'есе адчуваецца некаторая недапрацаванасць. П'еса была, відаць, спачатку задумана аўтарам у адным, больш сур'ёзным плане, а потым зведзена да фарса.

Гэта—першая камедыя ў нашай драматургіі,—адзначае тав. П. Глебка. Гэта — п'еса вострых камічных палажэнняў і яркіх тыпаў. Слабасць п'есы — крыху штучнае падкрэсліванне вобраза Гарлахвацкага, незавершанасць раду камічных палажэнняў, недастаткова яркая абмалёўка дадатных персанажаў, недапрацаванасць фінала. Тав. Глебка дае станоўчую ацэнку ігры акцёраў Г. Глебава, Б. Платонава, Г. Грыгоніса.

Недахопам спектакля тав. Глебка лічыць яго залішне роўны, спакойны стыль, адсутнасць патрэбнай завостранасці ў распрацоўцы асобных камедыйных сцэн. Увогуле-ж, на высокамастацкім матэрыяле створан яркі і цікавы спектакль, які паказвае творчы рост тэатра.

Тав. Бярозкін лічыць, што п'есе нехапае патрэбнай глыбіні, глыбокай думкі. Задуманая як сатырычная камедыя, п'еса ў канцы ператвараецца ў просты фарс. Аўтар узяў надзвычай дробныя з'явы, кур'ёзы, што недастаткова для поўнацэннай камедыі. П'еса не мае стылёвага адзінства.

Найбольш удалым вобразам камедыі тав. Бярозкін лічыць вобраз Зёлкіна. Перараджэнне Тулягі дадзена ў п'есе недастаткова пераканаўча. Вобраз Чарнавуса надзвычай плоскі. Ён не мае самастойнага значэння ў камедыі.

— Няма ў п'есе,—гаворыць тав. Бярозкін,—арганічнай камедыйнасці, таму ў п'есу ўведзен канферанс'е—цёця Каця.

«Хто смяецца апошнім»—першы вопыт стварэння сатырычнага твору ў беларускай драматургіі,—адзначае тав. Б. Малкін. Тав. Малкін указвае на рад вельмі трапных і ўдалых акторскіх знаходак у выкананні ролей Глебавым, Грыгонісам. Асобна тав. Малкін спыняецца на радзе недапрацаванасцей у мастацкім афармленні, у грыме і касцюмах персанажаў.

Тав. Сегедзі (Упраўленне па справах мастацтваў) сваё выступленне прысвяціў дыскусіі, якая разгарнулася ў друку па спектаклю «Хто смяецца апошнім». Разам з гэтым ён указаў на майстэрскае выкананне асноўных ролей п'есы засл. акторамі рэспублікі Г. Глебавым, Л. Рахленка, Б. Платонавым.

Засл. арт. рэсп. Л. Рахленка падзяліўся сваімі думкамі пра створаны ім у спектаклі вобраз Гарлахвацкага.—Я імкнуўся акрэсліць яго,—заўважае тав. Рахленка,—як хітрага ворага і разам—зарваўшагася нахала. Тав. Рахленка палемізіруе з тав. Бярозкіным, даводзячы, што перараджэнне Тулягі дадзена ў п'есе пераканаўча. Тулягу, як і многім, падобным да яго, дапамагла стаць сапраўдным совецкім чалавекам, актыўным і смелым, наша партыя. Рэжысёр МХАТ'а тав. Раеўскі сваёй работай над гэтай пастаноўкай даў шмат карыснага акторам, паглыбляючы іх майстэрства. Над спектаклем мы будзем працаваць і надалей,— заявіў тав. Рахленка,—і разам з аўтарам знойдзем больш дасканалае рашэнне фінала.

Тав. Кучар выступіў супроць ацэнкі п'есы і спектакля, дадзенай Бярозкіным. Тав. Кучар адзначыў стварэнне аўтарам яркіх, жыццёвых тыпаў, майстэркі дыялог, што робіць гэтую п'есу выдатным творам нашай драматургіі.

Творчая дыскусія аб спектаклі Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра «Хто смяецца апошнім» паказала наяўнасць агульнай думкі: гэта таленавітая п'еса і гэты яркі, культурны спектакль узбагачаюць наша мастацтва, беларускую совецкую драматургію.

А. Б.

Канцэрты артыстаў заходніх абласцей БССР

Выступіўшыя на канцэртах у Мінску артысты заходніх абласцей БССР у большасці сваёй безумоўна даравітыя людзі, але ўсіх іх еднае нейкая выканаўча-творчая безыдэйнасць, адсутнасць валявога імпульса, што з'яўляецца вынікам іх былога грамадскага і соцыяльнага становішча ў *панскай Польшчы*.

Малады Райхель—даравіты музыкальны скрыпач, але без сур'ёзнай школы. Яму яшчэ вельмі многа трэба вучыцца і працаваць.

Скрыпач Палескі валодае добрымі тэхнічнымі данымі. Але ў выкананні яго адсутнічаюць шчырасць, задушэўнасць, добры густ.

Артыстка Кац (сапрана)—упаўне склаўшаяся спявачка з добрым густам, з выдатнай інтанацыяй.

18-гадовы Вайнберг, бясспрэчна, адораны піяніст, з бліскучымі данымі, музыкальны, але яшчэ не афарміўшыся.

Выключная з'ява па сваёй разнабаковасці—Столаў. — кампазітар, піяніст і скрыпач, які выступаў на канцэрце ў якасці скрыпача і аўтара сваіх твораў. Вялікае, свежае і яркае творчае дараванне Столава, яго кампазітарскае майстэрства, уладанне фарбамі, тэмбрамі, цікавая гарманічная мова, вытокі якіх трэба шукаць у *творчасці кампазітараў Дэбюсі*, Равеля, Пракоф'ева, Шымaноўскага і Скотта, а таксама бездакорнае веданне інструментаў,—робіць яго адным з цікавейшых, падаючых вялікія надзеі кампазітараў.

Выступаўшая ў канцэрце артыстка Кульчыцкая — бліскучая эстрадна-аперэтачная спявачка з добрым вакалам і тэхнікай.

У заключэнне хочацца адзначыць майстэрскі акампанімент піяніста Хонеса.

Бясспрэчна, што цяпер, у совецкай краіне, гэтыя людзі па-сапраўднаму творча расквітнеюць.

А. ДЭМБО.

ТАЛЕНАВІТЫ АНСАМБЛЬ

Беларускія пагранічнікі пільна ахоўваюць заходнюю граніцу вялікага Совецкага Саюза. У час-ж адпачынку яны развіваюць свае таленты ў галіне мастацтва.

У чэрвені бягучага года, па ўказанню Наркома ўнутраных спраў СССР тав. Л. П. Берыя, у радзе пагранічных акруг, у тым ліку і ў Беларускай, былі створаны першыя ансамблі пагранічнай песні і пляскі.

Поўгода працуе ансамбль. І за гэты кароткі час ён дасягнуў выдатных поспехаў. У ансамблі 35 пагранічнікаў—байцоў і камандзіраў. Усе яны яўляюць сабою дружны спаяны калектыў. Выдатна спяваюць у гэтым ансамблі два браты Дзідзенка — Грыгорый і Пётр. Не менш таленавітыя і іншыя ўдзельнікі.

Палітрук тав. Залескі, адзін з старэйшых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці ў акрузе, напісаў для ансамбля выдатны літаратурна-музычны мантаж «Заходняя граніца»—аб радзіме, аб слаўных сынах яе, героях пагранічных будняў.

Перад слухачамі ўзнікаюць вобразы пагранічнікаў-герояў вызваленчай барацьбы. Іх праслаўляюць у песні і таму песня гучыць так лёгка, так урачыста. У ансамблі цудоўныя галасавыя магчымасці. Адчуваецца старанная, паўсядзённая праца. Выдатныя гарманісты! Музыку для ансамбля напісаў кампазітар І. Любан.

У хуткім часе ў Маскве адбудзецца агляд пагранічных ансамбляў. Паедуць для паказу сваіх поспехаў і беларускія пагранічнікі. У іх ёсць усё для таго, каб на гэтым аглядзе змагацца за першынства.

Таленавіты ансамбль у нашых мужных пагранічнікаў.

Е. САДОЎСКІ.

Я. М. КРУГЕР

Да 70-годдзя з дня нараджэння і 45-годдзя творчай дзейнасці.

Старэйшаму майстру беларускага выяўленчага мастацтва Я. М. Кругеру за плённую работу ў галіне жывапісу, за актыўную педагагічную дзейнасць і выхаванне кадраў мастакоў, за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці краіны. — указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 22 лістапада 1939 г. нададзена званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.


Я. М. Кругер нарадзіўся ў Мінску, у 1869 годзе, у беднай сям'і. Пачатковую адукацыю Якаў Маркавіч атрымаў у хедэры, а потым у рамесленым вучылішчы. Ужо з 7 год у Якава Маркавіча выявілася любоў да малявання.

Маляванне было яго любімым заняткам. У 1883 годзе дырэктар Мінскай гімназіі выпадкова звярнуў увагу на здольнасці хлопчыка і дапамог яму паступіць у Кіеўскую мастацкую школу Мурашкі. У 1886 годзе Якаў Маркавіч, пасля сканчэння Кіеўскай мастацкай школы, едзе ў Пецярбург, каб паступіць у Акадэмію мастацтваў. Але ажыццявіць гэта яму не ўдалося. Права жыхарства ў Пецярбургу Якаў Маркавіч не меў і яму прыйшлося вярнуцца ў Мінск. З Мінска Якаў Маркавіч пераязджае ў Варшаву. Там ён працуе пад кіраўніцтвам праф. Гаровіц, а затым, у 1888 годзе, едзе ў Парыж і паступае ў акадэмію Жульен.

З мэтай вывучэння твораў вялікіх майстроў жывапісу Якаў Маркавіч падарожнічае па еўрапейскіх краінах, наведвае музеі і карцінныя галерэі Англіі, Германіі і Бельгіі. Вярнуўшыся ў Расію, у 1895 годзе Якаў Маркавіч пры садзейнічанні Рэпіна атрымлівае магчымасць жыць у Пецярбургу і паступае ў Акадэмію мастацтваў.

У 1900 годзе за карціну «На суд прафесара» Я. М. Кругер атрымлівае званне мастака. Аўтатыпія з яго карціны змяшчаецца ў журнале «Нива» за 1901 г., а карціна набываецца Пензенскім музеем.

Пасяліўшыся пасля сканчэння Акадэміі ў сваім родным горадзе Мінску, Я. М. Кругер, акрамя творчай работы, займаецца педагагічнай дзейнасцю. З вялікімі цяжкасцямі Якаў Маркавіч дабіваецца дазволу на адкрыццё ў Мінску рысавальнай школы, кіраўніцтва якой ён бярэ на сябе. Шмат маладых таленавітых мастакоў вучылася ў Якава Маркавіча. Ён быў амаль адзіным у той час мастаком у Мінску. Усяляк, па меры сваіх сіл, Я. М. Кругер дапамагаў развіццю талентаў і здольнасцей у сваіх вучняў.



Я. М. Кругер.

Умоў для творчай работы ў годы царызма ў Якава Маркавіча не было. Змест яго работ таго часу вельмі абмежаваны. Партрэт, невялікая жанравая сцэнка — вось і ўсё, што было даступна ў той час мастаку.

Усё гэта вельмі прыгнятала Якава Маркавіча. Ён задумвае і піша карціну «Пагром». Карціна знішчаецца царскімі жандарамі.

Шмат работ Якава Маркавіча дарэвалюцыйнага перыяда было згублена, а таксама вывезена з музея і прыватных сабранняў нямецка-польскімі акупантамі.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла перад мастаком шырокія магчымасці для творчай і грамадскай дзейнасці. Ён пераключаецца на новую тэматыку, — прымае актыўны ўдзел у афармленні Музея рэвалюцыі БССР, піша для Музея партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, працуе выкладчыкам малявання ў школах і рабфаках Мінска, прымае дзейны ўдзел у рабоце ізосекцыі пры педкабінеце. На пасяджэннях ізосекцыі Якаў Маркавіч заўсёды даваў каштоўныя парады ў галіне мастацкай адукацыі і выхавання падрастаючага пакалення.

Вялікую работу Якаў Маркавіч правадзіў і ў якасці мастака-карэспандэнта многіх газет. Часта ў перыядычным друку паяўляліся яго зарысоўкі на разнастайную тэматыку сённяшняга дня, а таксама партрэты знатных людзей БССР.

Якаў Маркавіч добра валодае рысункам, і гэтыя зарысоўкі асабліва каштоўны тым, што яны з вялікай дакладнасцю і падабенствам перадаюць паказваемыя падзеі.

У сельскагаспадарчай комуне «Новае жыццё», дзе Якаў Маркавіч быў па камандыроўцы рэдакцыі газеты «Октябрь», мастаком напісан рад партрэтаў працоўных яўрэяў-калгаснікаў. Серыя гэтых партрэтаў і эцюдаў мела поспех на мастацкай выстаўцы ў Мінску ў 1930 годзе. Найбольш удалыя з іх: «Яўрэй-касец», «Першы арганізатар калгаса» і «Яўрэй-калгаснік».

Якаў Маркавіч Кругер зарэкамендаваў сябе як партрэтыст. Гэта сцвярджаюць яго многія партрэтныя работы.

Найбольш удаюцца Якаву Маркавічу партрэты з натуры. У іх ёсць пачуццё заканамернай кампазіцыі партрэта, пачуццё непасрэднай перадачы характара. Якаў Маркавіч часта карыстаецца фонам як сродкам для адлюстравання прафесіі паказваемых асоб. Так, напрыклад, партрэт майстра кавальнага цэха Якаў Маркавіч піша на фоне, які паказвае частку цэха з паравым молатам, партрэт народнага паэта БССР Якуба Коласа — на фоне беларускага пейзажа, партрэт яўрэйскага пісьменніка Абрамовіча (Мендэла Мойхер-Сфорым) — на фоне мястэчка і г. д.

Якаў Маркавіч шмат працаваў і пастэллю. У гэтай тэхніцы ён дасягнуў, бадай, найбольшых рэзультатаў. Усе яго работы пастэллю, асабліва «Партрэт жанчыны» (1914 г.), вылучаюцца асаблівай танальнасцю. Як на ўдалыя работы пастэллю можна яшчэ ўказаць на наступныя: «Партрэт М. Грэдзінгер» і «Партрэт старога партызана».

У работах кампазіцыйнага парадку, калі не лічыць яго дыпломнай работы «На суд прафесара», Якаў Маркавіч значна слабей.

За апошнія годы мастаком напісан рад партрэтаў любімага правадыра народаў вялікага Сталіна і яго саратнікаў, партрэты знатных людзей, вучоных і герояў-пагранічнікаў.

Вялікую творчую радасць мастаку прыносіць работа над вобразам вялікага Сталіна. Для выстаўкі «Ленін і Сталін— арганізатары беларускай дзяржаўнасці» мастака і, дзякуючы гэтаму, работы Якаўдаклад».

Творчы шлях Я. М. Кругера быў вызначан традыцыямі рускага рэалістычнага мастацтва. І мастак добрасумленна служыў сваёй творчасцю народу. Фармалістычныя шуканні і ўхілы не захаплялі мастака і дзякуючы гэтаму работы Якава Маркавіча заўсёды былі даступны разуменню шырокіх мас.

Клопатамі партыі і ўрада мастаку створаны ўсе ўмовы для далейшай плённай творчай работы.

Н. ДУЧЫЦ.



«На суд прафесара» (1900 год).
Карціна засл. дзеяча маст. Я. М. Кругера.

Юбілейны вечар Я. М. Кругера

30 лістапада ў Доме пісьменніка адбыўся вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння і 45-годдзю творчай дзейнасці заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Я. М. Кругера.

З дакладам аб творчасці і грамадскай дзейнасці юбіляра выступіў засл. дзеяч маст. А. Грубе. Ад імя ЦК юбіляра вітаў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Малін. Я. М. Кругера прывіталі таксама засл. дзеячы мастацтваў Керзін і Ахрэмчык, мастакі т.т. Мільчын, Сокалаў і ад Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. Гурскі.

Адказваючы на прывітанні, Я. М. Кругер выказаў глыбокую сваю ўдзячнасць партыі, совецкай уладзе і вялікаму Сталіну за клопаты аб мастацтве.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76. Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Д—1144.